ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 34-ы
№ 10 (2063)
1 лютага 1966 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЕРАМОЖЦУ—ПЕРАХОДНЫ ЧЫРВОНЫ СЦЯГ

Калегія Міністэрства культуры БССР, прэзідыум Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў культуры і бюро ЦК ЛКСМБ абмеркавалі вынікі падрыхтоўкі культурна-асветных устаноў да работы ў зімовых умовах. Адзначана, што летась была праведзена значная работа па рамонту, забеспячэнню палівам і добраўпарадкаванню клубаў, музеяў, бібліятэк, па ўмацаванню матэрыяльнай базы ўстаноў культуры.

Найбольш вызначыўся Рэчыцкі раён. Тут ля многіх клубных будынкаў пасаджаны мемарыяльныя паркі, абсталяваны спартыўныя і танцавальныя пляцоўкі. У рамонце і добраўпарадкаванні культасветустаноў прымала ўдзел грамадскасць, кіраўніцтва калгасаў і саўгасаў.

Значная работа была праведзена і ў Гродзенскім раёне, дзе да 15 кастрычніка 1965 года бібліятэкі і клубы атрымалі пашпарты гатоўнасці да зімы.

Добра падрыхтаваны ўстановы культуры да зімы ў Брагінскім, Бярозаўскім, Чавускім, Нясвіжскім і Лепельскім раёнах.

Рэчыцкаму раёну (загадчык аддзела культуры В. Рагоўская, старшыня райкома прафсаюза работнікаў культуры І. Маслоўскі, сакратар РК ЛКСМБ Л. Аўчыннікаў) за дасягнутыя поспехі ў падрыхтоўцы культасветустаноў да зімы прысуджаны пераходны Чырвоны сцяг Міністэрства культуры БССР, БРК прафсаюза культуры і ЦК ЛКСМБ.

Абвешчана падзяка загадчыку Гродзенскага раённага аддзела культуры В. Шостаку, старшыні райкома прафсаюза работнікаў культуры А. Малюжыцу, сакратару РК ЛКСМБ Н. Ажгірэю, а таксама загадчыку Брагінскага раённага аддзела культуры Т. Карпавай, старшыні райкома прафсаюза работнікаў культуры А. Некрашэвіч і сакратару РК ЛКСМБ М. Мачуленка.

ПОДЗВІГІ ЖЫВУЦЬ У НАРОДЗЕ

Гэтымі днямі ЦК КП Беларусі прыняў рашэнне «Аб далейшай рабоце па ўвекавечанню гераічных подзвігаў савецкіх людзей у перыяд Вялікай Айчыннай вайны».

Работнікі музеяў рэспублікі пачалі складаць планы правядзення навуковых экспедыцый, арганізацыі выставак, мантажоў, стварэння філіялаў музеяў. Рэдакцыя звязалася па тэлефоне з некаторымі культасветустановамі.

ПРА МУЖНЫХ І СМЕЛЫХ

У Гродзенскім гісторыка-краязнаўчым музеі да тэлефона падышоў дырэктар музея М. Собаль. Ён расказаў:

— Нядаўна ЦК КП Беларусі прыняў пастанову аб далейшай рабоце па ўвекавечанню гераічных подзвігаў савецкіх людзей у перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Работнікі музея вывучаюць гэты дакумент. На Гродзеншчыне ёсць нямала месц, звязаных з гераізмам беларускіх партызан у гады барацьбы з фашызмам. Магчыма, будуць створаны філіялы музея, падрыхтаваны новыя экспазіцыі, афармлены выстаўкі і г. д.

Магу паведаміць чытачам «Літаратуры і мастацтва», што мы працягваем работу па выяўленню нашых землякоў, якія ўдзельнічалі ў барацьбе з ворагам на зямлі іншых краін. Некаторыя з іх падтрымліваюць сувязь з музеем, дасылаюць нам успаміны, дапамагаюць выяўляць новых герояў руху еўрапейскага Супраціўлення. Нядаўна мы пазнаёміліся з калгаснікам з Воранаўскага раёна Браніславам Зузо. Ён актыўны ўдзельнік французскага Супраціўлення. Зузо перадаў музею вельмі цікавы і каштоўны экспанат — форму адзення французскіх партызан, якое ён насіў у гады вайны. Ёсць у нас два сцягі і дакументы, якія сведчаць аб барацьбе з фашызмам. З часам збярэцца цікавая экспазіцыя.

Хачу дадаць, што трэці год пры музеі працуе клуб рэвалюцыйнай славы. Члены клуба арганізоўваюць цікавыя вечары і сустрэчы, збіраюць успаміны ўдзельнікаў рэвалюцыйных баёў на Гродзеншчыне.

У ПОШУКАХ АБАРОНЦАЎ БАРЫСАВА

Работнікі Барысаўскага краязнаўчага музея вядуць пошукі герояў Вялікай Айчыннай вайны, якія ўдзельнічалі ў абароне Барысава ў 1941 годзе і ў яго вызваленні ад фашысцкіх захопнікаў. Сабрана многа дакументаў, якія апрацоўваюцца і рыхтуюцца да экспанавання. Нядаўна ваеннаслужачы, Герой Савецкага Саюза Якаў Крэйзер, які жыве ў Маскве, прыслаў музею каштоўныя дакументы — свае ўспаміны аб баях пад Барысавам у 1941 годзе, гістарычную даведку аб дывізіі, якая абараняла горад, і асабістыя фотаздымкі.

Цікавая гісторыя адных пошукаў. Неяк было выяўлена, што ў затоцы каля вёскі Касцюкі затоплена нейкая вялікая рэч. Пачалі выцягваць. Гэта аказалася гармата. Раней было вядома, што тут савецкія артылерысты вялі цяжкія баі з ворагам. Але дзе гэтыя людзі цяпер? Ці жывыя яны? Пра знаходку напісалі ў маскоўскія архівы і музеі. Праз некаторы час прыйшлі адказы з адрасамі. Аказалася, што адзін з абаронцаў Барысава, былы артылерыст цяпер падпалкоўнік у адстаўцы тав. Гразноўскі жыве ў горадзе Сумах. Нядаўна ад яго атрымалі пісьмо, у якім расказваецца пра гераічную абарону Барысава.

Так збіраюцца каштоўныя матэрыялы ад герояў бітвы на Бярэзіне.

НОВАЯ ЭКСПАЗІЦЫЯ

130 квадратных метраў плошчы зойме новая экспазіцыя Віцебскага абласнога музея. Тэматыка яе — пасляваеннае сацыялістычнае і камуністычнае будаўніцтва ў вобласці. На стэндах многа дакументаў і фотаздымкаў, якія расказваюць аб дасягненнях у развіцці прамысловасці, сельскай гаспадаркі і культуры.

У гэтым месяцы экспазіцыя будзе адкрыта для наведвальнікаў.



Хто з нас не назіраў у магазіне, дзе прадаюцца тэлевізары і радыёпрыёмнікі, такія сцэнкі. Ля стала, на якім дэманструецца тэлевізар, стаяць муж з жонкай і ўважліва глядзяць на экран. Дзяўчына-прадаўшчыца завучанымі рухамі круціць тумблеры.

— Нешта экран цьмяны,—уздыхнуўшы, гаворыць жанчына, — можа, другі пакажаце?

Дзяўчына надзімае губы, але ставіць другі тэлевізар і ўключае яго.

— О, тут бачнасць намнога лепшая,—гаворыць мужчына,— возьмем, Наташа?

Яго спадарожніца аглядае тэлевізар з розных бакоў.

— Але ж, як ён непрыгожа пафарбаваны! Глядзіце, нейкія плямы, як ад вільгаці. Не, такі тэлевізар сорамна паставіць у пакоі.

І яны адыходзяць. Прадаўшчыца, твар якой пакрываецца плямамі, адпускае ім услед некальні «ласкавых» слоў, маўляў, не ведаюць самі чаго ім трэба, працуе тэлевізар добра, дык не, бачыш, прыгажосць падавай...

Цяпер аб тым, якое дачыненне да падобных сцэнак маюць людзі на фотаздымку. Аказваецца, самае непасрэднае. Гэта мастакі-канструктары Мінскага радыёзавода. Падкрэслім, людзі новай на заводзе спецыяльнасці. Лабараторыя мастацкага канструявання, дзе яны працуюць, існуе толькі дзевяць месяцаў. Але зроблена нямала. Зроблена нямала ў тым напрамку, каб не паўтараліся сцэнкі, падобныя на тую, аб якой расказвалася вышэй.

Галоўны дэвіз, пад якім працуюць заводскія мастакі,—прадукцыя іх прадпрыемства, акрамя ўсяго іншага, павінна вабіць і з эстэтычнага боку. Быць прыгожай. Зробленай з густам.

Цяпер мастакі працуюць над афармленнем новых апаратаў: гэта радыёла «Рэха», стэрыяфанічная радыёла на паўправадніках «Рытм», уніфікаваны тэлевізар «УНТ-47».

На здымку Э. Трагубовіча вы бачыце мастакоў-канструктараў Л. Канцлера, Г. Дайнека, І. Старавойтава, О. Барчука і Р. Андрончык у лабараторыі.

ПОСПЕХ БРАГІНСКІХ КІНАФІКАТАРАЎ

Зона Перкаўскага сельсавета Брагінскага раёна заўсёды лічылася вельмі цяжкай для кінамеханікаў—доўгія гады нікому не ўдавалася выканаць тут план. Становішча змянілася, калі тут пачаў працаваць Васіль Шубянок—вопытны чалавек, які добра ведае запатрабаванні гледачоў. Толькі за мінулы год ён абслужыў звыш 25 тысяч гледачоў і заваяваў першынство ў раёне.

Сацыялістычнае спаборніцтва, якое шырока разгарнулася ў раёне, выявіла шмат ініцыятыўных і пісьменных кінамеханікаў—М. Леўчанка, Я. Кандрацейка, В. Камок і іншых.

Два гады назад пад кіраўніцтвам вопытных кінамеханікаў былі арганізаваны вытворчыя брыгады—адразу прыкметна палепшылася якасць работы і адказнасць некаторых кінамеханікаў. Амаль усе брыгады паспяхова выканалі гадавы план.

Кінафікатарам раёна ёсць чым ганарыцца—на 18400 сеансах у мінулым годзе пабывала звыш 916 тысяч чалавек.

Цяпер разгарнулася спаборніцтва за дастойную сустрэчу XXIII з'езда КПСС.

Кар. «Літаратуры і мастацтва».

ВЕЧАР ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ

Нядаўна ў Гродна быў створаны клуб творчых сустрэч, у які ўвайшлі артысты, пісьменнікі, самадзейныя кампазітары, работнікі культуры. Клуб правёў ужо сваё першае мерапрыемства — вечар творчай ініцыятывы. Праграму вечара вялі артысты Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра В. Грачынскі і П. Філіпаў. Затым Д. Бічэль-Загнетава і В. Ліпатава чыталі свае новыя вершы. Іх змянілі спевакі, чытальнікі, танцоры.

Удзельнікі вечара праглядзелі аматарскі кінафільм «Святкаванне ў Гродна 20-й гадавіны перамогі над фашысцкай Германіяй». Яго знялі настаўнік Л. Чарнілоўскі і артыст П. Філіпаў.

Хутка адбудуцца новыя вечары. У іх прымуць удзел кампазітары, мастакі, пісьменнікі.

Я. ЕЎСЦІГНЕЕЎ.

КУРСЫ КАЛГАСНЫХ БАЯНІСТАЎ-ХАРАВІКОЎ

Пры Стаўбцоўскай раённай музычнай школе пачалі работу двухгадовыя курсы па падрыхтоўцы баяністаў-харавікоў культасветустаноў. На курсах вучыцца 20 чалавек. У асноўным гэта загадчыкі калгасных і саўгасных клубаў.

Вучэбная праграма курсаў распрацавана метадыстамі Мінскага абласнога Дома народнай творчасці. Пад кіраўніцтвам выкладчыкаў мясцовай музычнай школы, а таксама спецыялістаў, запрошаных з Мінска і іншых гарадоў рэспублікі, будучыя кіраўнікі мастацкай самадзейнасці вывучаюць тэхніку ігры на баяне, музычную грамату, асновы дырыжыравання, хоразнаўства, музычную літаратуру.

Апроч таго, вучэбным планам прадугледжана азнаямленне слухачоў з домрай, балалайкай і іншымі народнымі інструментамі, знаёмства з фартэпіяна. Значная колькасць гадзін адводзіцца на заняткі ў харавым класе, а таксама на пытанні клубнай работы.

ДА ТРАДЫЦЫЙНАГА СВЯТА

Самадзейныя артысты Брэстчыны распачалі падрыхтоўку да традыцыйнага свята «Брэсцкая вясна». Над новымі праграмамі канцэртаў сёння працуюць гарадскі народны хор рускай песні, ансамбль песні і танца швейнай фабрыкі, хор дывановага камбіната і многія іншыя калектывы мастацкай самадзейнасці брэсцкіх прадпрыемстваў і ўстаноў.

Для ўдзелу ў «Брэсцкай вясне» ў горад над Бугам прыедуць танцавальны ансамбль «Юнацтва» Баранавіцкага баваўняна-папяровага камбіната, Пінскі гарадскі народны хор і яго танцавальная група.

Дарогай пошукаў

ЗАВОЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ РАБОТНІКАЎ КУЛЬТАСВЕТУСТАНОЎ

ЭКЗАМЕН НА ЖЫЦЦЁВАСЦЬ

Сёння вельмі важна знайсці такія формы работы мастацкай самадзейнасці, якія б актывізавалі работу нашых аматарскіх калектываў. Важна паклапаціцца аб сучасным высока-ідэйным рэпертуары, работа над якім спрыяла б росту выканаўчага майстэрства акцёра, нараджэнню новых гурткоў і прыцягненню ў іх яркіх талентаў з народа.

Нас, як і многіх іншых работнікаў культуры рэспублікі, вельмі хвалюе і непакоіць, як арганізаваць справу так, каб сельскія самадзейныя калектывы працавалі не ад выпадку да выпадку, не толькі ў час падрыхтоўкі да дэкад, агляду і конкурсаў. Што зрабіць, каб нас бясконца не дакаралі за работу дзеля славутай «галачкі», каб слова «паказуха» назаўсёды было выкінута з нашага лексікону?

Шукаючы адказ на гэтае пытанне, Магілёўскае абласное ўпраўленне культуры разам з Домам народнай творчасці вырашыла правесці эксперымент: стварыць абласны і раённыя тэатры народнай творчасці.

Назва «Тэатр народнай творчасці», вядома, сімвалічная. Пастаяннага творчага калектыву тут няма. Але ўсё ж такі тэатр на Магілёўшчыне ёсць, ён жыве, працуе, прыносіць нам і першыя радасці і нямала засмучэнняў. Відаць, так заўсёды бывае ў новай справе, калі яе жыццёвасць правяраецца на практыцы.

Домам народнай творчасці распрацавана палажэнне аб раённым і абласным тэатрах народнай творчасці. Адказнасць за работу абласнога тэатра ўскладзена на мастацкі савет Дома народнай творчасці, а за раённыя адказваюць мастацкія саветы раённых Дамоў культуры. Клопаты гэтых саветаў самыя разнастайныя: аб рэпертуары, аб метадычнай дапамозе самадзейным калектывам, аб праглядзе канцэртаў і абмеркаванні іх.

Мастацкі савет абласнога тэатра народнай творчасці сістэматычна кантралюе работу раённых тэатраў, аказвае ім творчую дапамогу.

У кастрычніку мінулага года аблвыканком прыняў пастанову аб арганізацыі абласнога тэатра народнай творчасці. У адпаведнасці з гэтым выканкомы гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў працоўных вырашылі стварыць тэатры народнай творчасці ў сваіх гарадах і раёнах.

Паўтараю: задума наша—зрабіць так, каб самадзейныя калектывы, асабліва сельскія, працавалі рэгулярна. Палажэнне аб раённым (гарадскім) тэатры народнай творчасці прадугледжвае як абавязковую ўмову, каб кожны калектыў мастацкай самадзейнасці не менш двух разоў на месяц выязджаў з абменным канцэртам у клубы раёна і адзін раз на год выступаў на сцэне раённага тэатра народнай творчасці.

Работа самадзейных калектываў фіксуецца ў спецыяльных пуцёўках. Па іх можна даведацца, з якой праграмай канцэрта, зацверджанай мастацкім саветам, выступалі артысты-аматары, сюды ж уносяцца запісы аб канцэртах і водгукі на іх. Гэта—своеасаблівая справаздача калектыву аб сваёй творчай рабоце і сустрэчах з гледачамі.

Лепшыя нумары самадзейных калектываў сельскіх клубаў, а таксама прадпрыемстваў, устаноў уключаюцца ў праграму справаздачнага канцэрта раённага (гарадскога) тэатра народнай творчасці. Гэты канцэрт ставіцца спачатку для працоўных свайго горада, а пасля на сцэне абласнога тэатра народнай творчасці.

Мы склалі план работы абласнога тэатра народнай творчасці, у якім вызначаны на год выступленні калектываў мастацкай самадзейнасці раённых тэатраў, а таксама народных тэатраў і вядучых тэатральных калектываў Магілёўшчыны.

Пасля справаздачных канцэртаў пяці раённых тэатраў народнай творчасці можна ўжо сказаць, што нам удалося зрабіць і што не атрымалася. Але бясспрэчна адно — тэатры заваявалі права на жыццё.

Хацелася б пагаварыць пра тыя цяжкасці і недахопы, з якімі мы сутыкнуліся. Далёка не ва ўсіх раёнах вобласці аднесліся да новай справы з поўнай адказнасцю і правільна зразумелі мэту і задачы тэатра народнай творчасці.

Сапраўды, за кароткі час цяжка было ажывіць работу літаральна ўсіх самадзейных калектываў, падрыхтаваць новыя канцэртныя праграмы і з лепшых нумароў сельскай самадзейнасці скласці цікавую праграму справаздачнага канцэрта. Крыху нязвыкла: раёны не атрымалі ўказанняў аб правядзенні чарговай дэкады, агляду ці конкурсу і раптам арганізоўвай канцэрты, клапаціся пра рэпертуар. Яшчэ жыве сіла інерцыі: у раёнах прызвычаіліся чакаць напамінкаў, дырэктыў зверху. На жаль, да сістэматычнай работы многія самадзейныя калектывы не прывучаны. Таму ў першых справаздачных канцэртах раёнаў прымала ўдзел мала новых сельскіх калектываў. На пасяджэннях мастацкага савета, калі абмяркоўваліся справаздачныя канцэрты Горацкага, Бялыніцкага, Бабруйскага, Чавускага раёнаў, адзначаліся такія недахопы, як слабае развіццё інструментальнага і харэаграфічнага жанраў. Былі зроблены істотныя заўвагі і па рэпертуары самадзейных калектываў, у прыватнасці, адзначана адсутнасць твораў на сучасную тэму.

Гэтая, па-сапраўднаму творчая размова мае і свае станоўчыя бакі. Перш за ўсё справаздачныя канцэрты даюць поўнае ўяўленне аб стане развіцця мастацкай самадзейнасці ў тым ці іншым горадзе або раёне. Такім чынам, мы маем магчымасць своечасова прымаць дзейсныя меры, каб ліквідаваць недахопы ў развіцці самадзейнага мастацтва пэўнага раёна. А самае галоўнае—тэатры народнай творчасці выключаюць усялякую парадняасць, паказуху ў рабоце калектываў мастацкай самадзейнасці, прывучаюць іх збірацца на рэпетыцыі сістэматычна, сур'ёзна і творча падыходзіць да падбору рэпертуару і складання праграмы справаздачных канцэртаў. Канцэрт жа будуць глядзець не толькі жыхары адной вёсні, але і суседзі з іншых вёсак, і працоўныя раёнага цэнтра.

Абменныя і справаздачныя канцэрты абуджаюць здаровае творчае спаборніцтва, што таксама актывізуе работу аматарскіх калектываў, прымушае кіраўнікоў і ўдзельнікаў гурткоў шырока і творча думаць, абуджае іх выдумку, ініцыятыву.

Як відаць, кіраўнікам калгасаў і саўгасаў, прадпрыемстваў давядзецца таксама сур'ёзна паклапаціцца аб музычных інструментах і касцюмах для сваіх калектываў, бо нікому не хочацца, каб калектыў выглядаў горш за іншыя.

Сістэматычнае правядзенне канцэртаў прымусіць паклапаціцца і пра ўласных музыкантаў - акампаніятараў. Тэатры народнай творчасці — гэта пастаянныя калектывы, іх не выручыць выпадковы баяніст, якога звычайна запрашаюць перад аглядам падыграць хору, салістам, танцорам. Агляд прайшоў, і баяніста не стала, — на жаль, так яшчэ часта бывае. Цяпер жа трэба працаваць сістэматычна, а значыць, мець свайго акампаніятара. Магчымасці для падрыхтоўкі баяністаў у нас ёсць. Пры музычных школах вобласці адкрыты курсы баяністаў, і кожны калгас або саўгас можа паслаць на гэтыя курсы свайго прадстаўніка. Акрамя таго пры рэспубліканскім і абласным Дамах народнай творчасці працуюць курсы па падрыхтоўцы кіраўнікоў самадзейных калектываў розных жанраў. Выпускнікі гэтых курсаў змогуць узначаліць работу калектываў мастацкай самадзейнасці.

Для таго, каб кіраўніцтва раёна дакладна ведала, як працуюць самадзейныя гурткі, мы на кожны справаздачны канцэрт, што адбываецца ў Магілёве, абавязкова запрашаем намесніка старшыні райвыканкома, загадчыка аддзела культуры, кіраўнікоў некаторых прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў.

Работа абласнога тэатра народнай творчасці шырока асвятляецца на старонках абласной газеты і па мясцовым радыё. Лепшыя нумары справаздачных канцэртаў раёнаў і гарадоў будуць запісаны на плёнку і перададзены па абласным радыё.

Ужо адбылося пяць справаздачных канцэртаў. Мяркуючы па адносінах да іх працоўных Магілёва, канцэрты маюць поспех. Усё больш гледачоў горада жадае пабываць на гэтых канцэртах, і мы часам не можам задаволіць усе заяўкі, якія паступаюць ад прадпрыемстваў і ўстаноў горада.

Першыя крокі пераконваюць нас, што мы пайшлі па правільным шляху. Тэатры народнай творчасці патрэбны! Мы разумеем, што нас чакаюць яшчэ цяжкасці, могуць быць няўдачы і расчараванні. Тым больш прыемнымі будуць для нас добрыя вынікі нашага вопыту, якія павінны карэнным чынам ажывіць творчае жыццё самадзейных калектываў вобласці.

Марыя СВЯРДЛОВА,
старшы метадыст Магілёўскага абласнога Дома народнай творчасці.

З УВАГАЙ ДА КОЖНАГА ЧЫТАЧА

Наш чытач з кожным годам расце, сталее духоўна. Гэта асабліва заўважаем мы, прапагандысты кнігі. Гадоў пяць—сем назад асноўная маса чытачоў Віцебскай гарадской бібліятэкі, дзе я працую, мела няпоўную сярэднюю адукацыю. А сёння 71 працэнт нашых чытачоў закончылі сярэднюю школу, вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Усё гэта патрабуе ад нас новых форм і метадаў работы як на абанеменце, так і ў чытальнай зале. Бібліятэкару трэба не толькі добра ведаць літаратуру, але і ўзровень, запатрабаванні кожнага чытача, каб, як гэта кажуць, кіраваць яго чытаннем. Праўда, у такім кіраўніцтве не ўсе чытачы бібліятэкі адчуваюць патрэбу. Аднак у той ці іншай форме патрабуюць нашай дапамогі ўсе чытачы.

На выдачы кніг у нас працуюць дзве асноўныя групы: адна памагае выбіраць літаратуру рабочым, інжынерна-тэхнічным работнікам, другая — служачым, студэнтам, вучням старэйшых класаў. Гэта дае магчымасць лепш ведаць, чым цікавіцца масавы чытач, памагаць яму павышаць веды па сваёй прафесіі.

А яшчэ зусім нядаўна мы выдзялялі толькі адну групу чытачоў, складалі для іх планы: напрыклад, што чытаць токару або слесару. Гэтыя рэкамендацыі ляжалі ў фармуляры чытача. Вялікага эфекту ад такога планавання чытання мы не мелі. Пачалі шукаць іншыя шляхі работы з чытачом. Пры перарэгістрацыі ў першую чаргу цікавіліся: кім працуе чалавек, што ён чытае, якія кніжкі мае дома па сваёй спецыяльнасці. На аснове гэтага былі распрацаваны анкеты тэматычнага чытання. Прапанавалі іх чытачам, яны падкрэслівалі неабходную ім літаратуру. Многія рабочыя і студэнты бралі за аснову свайго чытання кнігі па дзвюх—трох тэмах. Усё гэта адзначалася ў фармулярах кожнага чытача. Анкеты тэматычнага чытання дапамаглі нам больш правільна ўкамплектаваць кніжны фонд. Бібліятэка цяпер ведае, колькі патрэбна ёй экземпляраў той ці іншай кніжкі, мае магчымасць загадзя скласці заяўку ў бібкалектар на новую літаратуру. Апрача таго мы ведаем, што патрэбна мець у чытальнай зале і на абанеменце, якімі павінны быць тэматычныя выстаўкі, кніжныя паліцы, дзе і якія агляды навінак праводзіць.

На абанеменце бібліятэкі зарэгістравана звыш 4 600 чытачоў. З іх 3 952 чытаюць па нашых тэматычных планах. Гэтая літаратура дапамагае людзям не толькі ўдасканальваць свае веды па асноўнай прафесіі, але і пашыраць кругагляд па пытаннях эстэтыкі, навукі, літаратуры, мастацтва. Вось некаторыя з гэтых тэм: «Шлях у космас», «У свеце прыгожага», «Паэзія нашых дзён», «Ля карты свету», «Хімія ў нашым быце», «Як прыгожа апранацца» і інш.

Сёлета бібліятэка распачала інфармацыйную работу па метаду «Кніга—адрас». Складаецца картатэка прафесій чытачоў для таго, каб кожная кніжка дакладна трапляла па адрасу.

Мы плануем больш увагі аддаваць бібліяграфічным аглядам. Летась іх было праведзена каля 130. Вядома, гэтага мала. Цяпер мы праводзім інфармацыі аб кніжных навінках, наладжваем адкрыты прагляд кніг.

За мінулы год у бібліятэцы было арганізавана 134 выстаўкі літаратуры. Яны расказалі наведвальнікам пра гісторыю роднага краю і яго людзей ад сівой старадаўнасці да нашых дзён. Асабліва цікавіліся чытачы выстаўкамі, прысвечанымі Кастрычніку і Вялікаму Леніну, мужнасці і гераізму савецкіх людзей у дні Вялікай Айчыннай вайны, працоўным подзвігам нашага народа.

Мы будзем і надалей удасканальваць формы і метады прапаганды кнігі. Спадзяёмся і на дапамогу чытачоў. Іх прапановы і заўвагі ў многім выкарыстоўваем у рабоце.

Перад выдачай кніг бібліятэкару, вядома, трэба пазнаёміцца з тымі навінкамі, якія ён будзе рэкамендаваць свайму чытачу. Гэта і асобныя выданні твораў, і творы, змешчаныя ў перыядычным друку, а таксама бібліяграфічныя дапаможнікі. А яшчэ неабходна падумаць і пра бібліятэчныя плакаты, ды наогул набярэцца шмат іншых клопатаў, без якіх нельга пачынаць работу з чытачом. На жаль, бібліятэкар часта на гэта не мае часу. Адкрываеш бібліятэку, і адразу да цябе за кнігай прыходзіць чытач. Відаць, варта падумаць аб тым, каб кожны бібліятэкар меў час на ўнутраную работу, ад якой у многім залежыць поспех прапаганды кнігі.

Д. СОРКІНА,
загадчыца Віцебскай цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Горкага.

БЕЛАРУСЬ АРХІТЭКТУРНАЯ



Так будзе выглядаць адміністрацыйна-гандлёвы цэнтр новага мікраёна.

Малюнак Р. ЛАНДАРСКАГА і А. ШНЫПАРКОВА.

НА ПОЎНАЧЫ ГОМЕЛЯ

Пройдзе некаторы час, і непазнавальна зменіцца паўночны раён Гомеля. Тэрыторыя ад вуліцы Савецкай да поймы ракі Сожа будзе забудавана новымі 5—12-павярховымі дамамі.

Праект забудовы жылога масіву распрацаваны гомельскімі архітэктарамі К. Усцюгавым, Л. Патапавым і Я. Казловым.

Фасады жылых дамоў, вышынных будынкаў, гасцініц і дамоў спартыўных таварыстваў будуць упрыгожваць вялікія плоскасці шкла. У аздабленні шырокае прымяненне знойдзе бутавы камень.

Мікраёраён будзе мець свой адміністрацыйна-гандлёвы цэнтр з пешаходнай плошчай і басейнам, палацам культуры, кінаканцэртнай залай. Аўтары прапануюць разбіць групавыя сады.

У новым масіве будуць жыць 35 тысяч гамяльчан.

ЭКЗАМЕНУЮЦЦА КІРАЎНІКІ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Заканчваецца першая палавіна навучання на Рэспубліканскіх пастаяннадзеючых курсах па падрыхтоўцы кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці пры Міністэрстве культуры БССР. На экзаменах навучэнцы паказваюць урыўкі з п'ес «Раскіданае гняздо» Я. Купалы, «Ірынка» К. Чорнага, «Несцерка» В. Вольскага, «Мядзведзь» А. Чэхава, «12 месяцаў» С. Маршака, «Далі неаглядныя» М. Вірты і інш.

Гэты здымак зроблены ў час здачы экзаменаў па майстэрству акцёра на драматычным аддзяленні курсаў (выкладчыца В. Сабалеўская). Сцэна са спектакля «Ірынка». У ролі чырвонаармейца — слесар Аршанскага завода швейных машын Л. Трушко, Ірынкі — курсантка з Нясвіжскага раёна Валя Шыбут.

ПРАЦЯГВАЕМ РАЗМОВУ

ЧЫМ ДАПАМАГЧЫ ЭСТРАДЗЕ?

СЛОВА—СЛОВУ!

Нядаўна мне давялося выступаць у эстрадным зборным канцэрце на вечары дзесяцікласнікаў, прысвечаным заканчэнню зімовых канікулаў. Прызнаюся шчыра, канцэрт пачаўся не вельмі ўдала: маладыя людзі паводзілі сябе шумна, і першыя нумары былі прыняты даволі холадна. А тут яшчэ чорт мяне падштурхнуў сказаць некалькі рэпрызаў не першай свежасці. Зала яшчэ больш зашумела. Вядома, я нерваваўся і ў думках прыкідваў: якім чынам выправіць становішча? Нарэшце, мы з артысткаю В. Спіткоўскай разыкнулі прачытаць некалькі лірычных вершаў маладых савецкіх паэтаў пра моладзь і для моладзі.

Было аб'яўлена: «У нашай эстраднай праграме прадугледжана пяць мінут паэзіі. Лірыка савецкіх паэтаў».

І ўявіце, зала прыціхла, насцярожылася, а потым узарвалася воплескамі. Мы «бісіравалі» і замест аб'яўленых пяці мінут чыталі дваццаць.

Пазней мы гутарылі з арганізатарамі гэтага канцэрта, з яго слухачамі, цікавіліся, чаму ўсё-такі на пачатку былі так дрэнна прыняты аўдыторыяй. Адказ быў шчыры. Нам сказалі: «Падобныя зборныя эстрадныя канцэрты мы ведаем напамяць. Загадзя можам сказаць, што «выдасць канферансье, што праспяваюць спявачкі ці спявак і што пасля гэтага станцуюць танцоры. А вось паэзію ў эстрадным канцэрце мы пачулі ўпершыню і слухалі, як бачыце, з захапленнем».

У гэтых словах быў для ўсіх нас горкі, але і вельмі справядлівы дакор. Сапраўды, часцей за ўсё праграмы так званых эстрадных зборных канцэртаў складаюцца па прынцыпу — усялякіх жанраў патрошку: спявак, спявачка, інструменталіст, акрабатычная або танцавальная пара і, вядома, — канферансье (ён жа фельетаніст, парадыст, куплетыст і нават чытальнік). Рэдка эстрадныя праграмы падпараджаваны якой-небудзь адной тэме або нясуць след хоць бы якой-небудзь сцэнарнай ці рэжысёрскай задумы. І ўжо зусім рэдка сустракаюцца эстрадныя тэатралізаваныя паказы. Амаль не відаць на сцэне вадэвіляў, скетчаў. Праграмы эстрадных канцэртаў складаюцца па стэрэатыпу. Мусіць таму яны так падобныя.

Адным з вядучых жанраў эстраднага мастацтва заўсёды з'яўлялася слова. Уласна кажучы, «размоўны жанр» нясе асноўную ідэйную нагрузку ў канцэртах. Але поспех выступлення артыста-размоўніка залежыць ад якасці літаратурнага матэрыялу, яго вастрыні, надзённасці, мастацкай вартасці. Прапісныя гэтыя ісціны добра вядомыя, аднак да апошняга часу са шматлікіх жанраў эстраднага мастацтва самым слабым якраз і з'яўляецца размоўны.

Чым вытлумачыць такую парадаксальную з'яву? Думаецца, перш за ўсё тым, што ў нас у Белдзяржфілармоніі амаль зусім няма аўтарскага калектыву, які б пісаў для эстрады. Рэпертуар выканаўцаў невыразны. Арыгінальны беларускі матэрыял у ім амаль адсутнічае.

Другая прычына хібаў эстрадных праграм — адсутнасць кваліфікаванай рэжысуры, часцей за ўсё — усялякай рэжысуры. Зразумела, у такіх абставінах нават таленавітыя артысты не могуць на поўную меру вырашыць свае творчыя задачы. Не трэба забываць, што мастацтва эстрады вельмі спецыфічнае: выканаўца часам літаральна на працягу адной-дзвюх мінут павінен стварыць такі вобраз, на які ў тэатры спатрэбіліся б, можа, усе тры акты.

І, нарэшце, трэцяя прычына — поўная інертнасць саміх выканаўцаў у пошуках рэпертуару. Вядома ж, лягчэй за ўсё ўзяць гатовы і выпрабаваны фельетон, напісаны для сталічнага артыста, і прыстасаваць яго неяк да сваёй праграмы. Цяжэй самому задумаць фельетон, хай нават на тую ж тэму, знайсці аўтара, папрацаваць з ім, з рэжысёрам і, нарэшце, стварыць свой, толькі твайму творчаму стылю ўласцівы нумар. Гэта складана, але гэта неабходна рабіць, каб не ператварыцца ў капіроўшчыка, бо, як кажа прыказка, — пад лежачы камень і вада не цячэ. Магчыма, з-за падобнай інертнасці мы, выступаючы ў Саратаве, і расказваем аб Неўскім праспекце, а не аб прыгажосці Мінска.

Давайце паглядзім, як папаўняецца рэпертуар артыстаў размоўнага жанру ў нашай філармоніі. У нас у штаце ёсць загадчык літаратурнай часткі, у задачу якога ўваходзіць, апроч рэдакцыйнай работы, забеспячэнне рэпертуарам выканаўцаў і выяўленне новых аўтараў. Што датычыць рэдагавання, дык тут справы ідуць большменш добра. Акуратна праглядаецца перыёдыка, даюцца рэкамендацыі (не заўсёды, праўда, удалыя). Але вось самага галоўнага — калектыву аўтараў, якія б пісалі для эстрады, у нас як не было, так і няма.

Давялося мне неяк праглядаць звычайныя насценныя газеты ў політэхнічным інстытуце... Колькі там яркіх гумарыстычных замалёвак, эпіграм! Відаць, што іх стваралі людзі з багатай творчай фантазіяй. А які невычэрпны каскад арыгінальных знаходак можна часам сустрэць на студэнцкіх вечарах самадзейнасці! І, думаецца, якраз тут трэба шукаць маладых аўтараў, чэрпаць той эстрадны матэрыял, які нам усім так неабходны.

Нельга не сказаць пра перашкоды, якія паўстаюць на шляху твора да эстрады. Дапусцім, аўтар стварыў арыгінальную рэч. Перш чым убачыць святло рампы, яна павінна спадабацца артысту, кіраўніцтву розных аддзелаў і пададдзелаў, быць прынята мастацкім саветам філармоніі, ухвалена рэпертуарнай камісіяй міністэрства, прайсці цэлы рад «дапрацовак», «апрацовак», «перапрацовак»... Што датычыць атрымання аўтарам належнага ганарару, дык яшчэ не адзін тыдзень міне. Усё гэта, зразумела, не садзейнічае актыўнаму ўдзелу пісьменнікаў у стварэнні эстраднага рэпертуару.

Як бы там ні было, але склалася такое становішча, што для нашых артыстаў-размоўнікаў пішуць усяго тры—чатыры таварышы і то ад выпадку да выпадку. Таму нярэдка самі выканаўцы вымушаны брацца за пяро, каб хоць як-небудзь ліквідаваць рэпертуарны голад. Што грэх таіць, не заўсёды гэтыя рэчы, створаныя ў аматарскім парадку, вызначаюцца высокімі мастацкімі вартасцямі.

Прырода эстрады такая, што кожны артыст размоўнага жанру з'яўляецца нібы своеасаблівым маленькім тэатрам, са сваім, аднаму яму ўласцівым, почыркам. Значыць, і рэпертуар, апроч сваіх высокіх ідэйна-мастацкіх вартасцей, павінен адпавядаць творчай індывідуальнасці акцёра. Толькі ж рэпертуарным голадам можна растлумачыць такі факт, калі наш вельмі здольны артыст Віктар Сінайскі ўключыў у сваю праграму фельетон, напісаны ў востра публіцыстычным стылі, а выконвае яго ва ўласцівай яму мяккай манеры. Драматычны матэрыял, зразумела, ад гэтага не дасягае грамадзянскага гучання, прайграе.

Безумоўна, рэпертуарны партфель нашай філармоніі бедны. Аднак кіраўніцтва эстраднага аддзела цалкам не выкарыстоўвае нават тое, што ёсць. Наша літаратура вялікая і шматгранная. Выступленні ж майстроў мастацкага слова ў эстрадных праграмах — з'ява рэдкая.

Час нам стварыць у філармоніі кампактны перасоўны тэатр эстрадных мініяцюр. Такі калектыў мог бы выконваць вадэвілі і сцэнкі з класічнай спадчыны, сучасныя мініяцюры і скетчы. Дарэчы, група беларускіх аўтараў напісала ў свой час сцэнарый паказу «Лявоніха на эстрадзе». Пры некаторай дапрацоўцы гэты твор мог бы ўбачыць святло рампы. Раней некаму было рэалізаваць сцэнарый, а цяпер з «Лявоніхі на эстрадзе» мог бы пачаць сваё творчае жыццё тэатр мініяцюр.

Шлях эстраднага твора ад артыста да слухача даўгі, твора літаратуры — яшчэ даўжэйшы. Хацелася б, каб Белдзяржфілармонія, Міністэрства культуры БССР, Саюз пісьменнікаў Беларусі больш аддавалі ўвагі важнейшаму эстраднаму жанру — размоўнаму, каб слова заняло належнае месца ў баявым мастацтве эстрады.

Мікалай ЗОРЫН,
чытальнік.

ВЕЧАР ПАМЯЦІ ПАЭТА

28 студзеня ў клубе Саюза пісьменнікаў БССР адбыўся вечар, прысвечаны 60-годдзю з дня нараджэння вядомага беларускага паэта Андрэя Александровіча.

Ва ўступным слове Пятро Глебка расказаў пра літаратурную, грамадска-палітычную і навуковую дзейнасць паэта. Алесь Звонак зрабіў даклад пра жыццё і творчасць А. Александровіча. З успамінамі аб сустрэчах з паэтам расказалі А. Янімовіч, С. Шушкевіч і С. Грахоўскі.

Творы пісьменніка чыталі са сцэны артысты Тэатра імя Горкага гледача, затым артысты Тэатра оперы і балета і Беларускай філармоніі далі канцэрт.

ТЕАТР № 2

Лютаўская кніжка «Тэатра» адкрываецца артыкулам А. Галдобіна «У лепшых традыцыях».

Разнастайны раздзел «Спектаклі». Тут артыкулы Ін. Папова (пра оперу А. Новікава «Цаною жыцця» ў Музычным тэатры імя К. С. Станіслаўскага і Ул. І. Неміровіча-Данчанкі), Л. Булгак (пра новую рэдакцыю спектакля «Сям'я» І. Папова ў Маскоўскім тэатры імя Ленінскага камсамола), Е. Холадава (пра камедыю А. Астроўскага «Праўда — добра, а шчасце лепш» у Малым тэатры), О. Пыжоваў (пра п'есу Э. Заля «Пастка» ў Тэатры імя Я. Вахтангава), Віт. Дзмітрыеўскага (пра п'есу «Табе прысвячаецца» М. Брэменера ў Ленінградскім ТЮГу).

Слову на эстрадзе прысвечаны артыкул майстра мастацкага чытання Сурэна Качарана. Аўтара непакояць яўныя адзнакі таго, што развіццё гэтага мастацтва «ідзе больш ушырыню і менш углыбіню».

Цікавы нарыс Юрыя Алянскага «Кавалер ордэна Уладзіміра з мячамі і бантам» прысвечаны артысту Ленінградскага тэатра драмы імя А. С. Пушкіна Н. Лявіцкаму, удзельніку першай сусветнай вайны, абаронцу блакіраванага Ленінграда.

Партрэтная галерэя «Театра» папоўнілася яшчэ двума нарысамі: пра балерыну Ірыну Калпакову напісала В. Чысцякова, а пра артыста маскоўскай аперэты Васілія Алчэўскага — І. Шумская.

У сувязі з 90-годдзем з дня нараджэння А. В. Луначарскага, якое споўнілася нядаўна, часопіс публікуе яго артыкул пра аднаактовыя п'есы і матэрыялы пра «справу», сфабрыкаваную ў 1900 годзе жандарамі ў сувязі з рэфератам А. В. Луначарскага пра Генрыка Ібсена.

Працягваецца публікацыя раздзелаў з кніг Алісы Коанен «Старонкі з жыцця» і Луі Армстронга «Маё жыццё ў музыцы».

У раздзеле «За рубяжом» артыкулы Б. Зінгермана («Пра Аліўе ў ролі Атэла і пра «Атэла», трагедыю Шэкспіра»), Андрэя Золатава («Урокі «Комішэ опер») і І. Мягковай («Новы балет Прагі»), а таксама паведамленні пра падзеі на сцэнах свету.

Нумар завяршаецца камедыяй армянскага драматурга Гарэгіна Бес «Лік: нуль—нуль» у перакладзе і сцэнічнай рэдакцыі Аляксея Файко.

ЦЕНІ З ТАГО СВЕТУ

ІХ ПРАФЕСІЯ—ЗДРАДА

Быў час, калі яны стаіліся, нібы мышы, глыбока залезлі ў норы. Трывога і неспакой апанавалі іх. Працэс за працэсам: у Нюрнбергу, Варшаве, Празе... Хадзілі чуткі, ад якіх кідала ў халодны пот. Скончаць з галоўнымі гітлераўскімі верхаводамі, возьмуцца за такіх, як яны, памагатых.

Страх апаноўваў гэткі, што не рады былі адзін аднаму. Хіба ўгадаеш, хто які камень трымае за пазухай? І пры гітлераўцах не заўсёды можна было даверыцца: кожны імкнуўся выслужыцца, вылезці наперад. А цяпер у імя выратавання сваёй шкуры тойсёй гатоў роднага бацьку прадаць. Праўда, са сваімі блізкімі не так было небяспечна. Аднаго поля ягады. Больш за ўсё непакоілі сустрэчы з ніжэйшымі паліцэйскімі чынамі і падначаленымі. Тыя не разбіраліся ва ўсіх тонкасцях сітуацыі. Возьме, чаго добрага, ды і ляпне пры ўсіх: «Як здароўе, былы спадар прэзідэнт Астроўскі? Чым займаецеся, спадар былы бургамістр Станкевіч? Ці не думаеце пра новую газету, спадар Казак?»

Хіба мала здаралася ўжо гэткіх выпадкаў?! Даволзілася вышэй падумаць каўнер і праз зубы цадзіць:

— Вы, відаць, памыліліся. Я не той, за каго вы мяне прымаеце... Я— Корбут.

Час быў такі, што лепш забыцца пра сваё прозвішча, а тым больш пра чыны. Так і рабілі. Мала хто не жыў пад чужымі прозвішчамі. Ды яшчэ трымалі пра запас і не адно.

Стаіўся тады, прыціх галоўны важак Радаслаў Астроўскі. Усё ж ён, а не хто іншы, быў прыбліжанай асобай стаўленіка Гітлера на Беларусі генеральнага камісара Готберга. З яго рук атрымаў пост прэзідэнта так званай Беларускай цэнтральнай рады. Вядома, не за так. Потым адслужыў. Не без яго ўдзелу 380 тысяч беларускіх юнакоў і дзяўчат былі прададзены ў гітлераўскае рабства. Не без яго дапамогі наладжваліся масавыя расстрэлы савецкіх людзей, паляванні на яўрэяў, карныя экспедыцыі, у часе якіх вышчэрваліся цэлыя паселішчы. Надзвычайная камісія ўсё занатавала, усё высветліла. Есць над чым задумацца. І ўсё ж паплечнік Готберга не вешаў галавы. За сваё жыццё ён не раз трапляў і не ў гэткія складаныя сітуацыі, і ўсё канчалася добра. Змог жа ён быць некалі карысным і царскай ахранцы, паслужыў і кайзеру, Пілсудскаму, а калі прыйшоў Гітлер— і яму. Важна пад гарачую руку не трапіць, перачакаць.

— Дальбог, мы яшчэ дажывём да такога часу, калі будзем самымі паважанымі людзьмі ў амерыканцаў,— суцяшаў сваіх блізкіх гэты стары правакатар.

І ён як у ваду глядзеў. Праўда, лепшы сябар гітлераўскага генерала Готберга ў такім ужо ўзросце, калі трэба збірацца на вечны спачын. З яго, як кажуць, узяткі гладкі. Тым не менш амерыканскія ўлады, відаць, улічваючы яго заслугі перад гітлераўскім рэйхам, з вялікай гасцінасцю далі яму прытулак у сваёй краіне. І той акрыяў, засеў за мемуары. Ен даказвае, што паход Гітлера на Савецкую Расію быў мэтазгодны, і настолькі расхрабрыўся, што нават упікае амерыканцаў: маўляў, не на тых стаўку рабілі, не тых саюзнікаў выбралі. Хіба можна было дапусціць разгром Гітлера?! Старога злачынцу суцяшае адно, што амерыканцы ўрэшце-рэшт за розум узяліся. Бач, як размахнуліся ў В'етнаме! Пах людской крыві п'яніць былога паплечніка генерала СС Готберга, выклікае неўтаймоўныя эмоцыі. Ен не траціць надзеі на тое, што амерыканцы не спыняцца на гэтым, і ён, Радаслаў Астроўскі, на схіле свайго жыцця з'явіцца на белым кані ў радах пераможцаў на вуліцах Мінска...

Відаць, не так ужо і многа возьмеш з гэтай лухты. Ды і ці варта крыўдзіцца на старую разваліну, якая жыве ў мінулым і здатна цяпер толькі на тое, каб абгрунтоўваць сваё «гістарычнае супрацоўніцтва з гітлераўцамі». Затое гадунцы Радаслава аказаліся нішто сабе хлопцы. Без такіх, як яны, напэўна б, сёння не існавалі «Інстытут па вывучэнню СССР», «Амерыканскі камітэт вызвалення». І, канечне, не існавала б радыёстанцыя «Свабода».

Тут знайшлі сабе прытулак многія з былых сяброў Астроўскага. Іх голас час ад часу можна пачуць у эфіры. Адны выдаюць сябе за знаўцаў эканомікі Савецкай Беларусі, другія — за экспертаў культуры. Той-сёй начапіў для большай важнасці вучоныя званні: прафесар, доктар навук. Праўда, не ўсе яшчэ адважваюцца назваць адкрыта свае прозвішчы. З тых самых сумных дзён, як прыйшоў канец гітлераўскаму рэйху, многія ўчэпіста трымаюцца за псеўданімы: Арцём Загорны, Алесь Галубіцкі, Андрэй Залескі, Васіль Крыцкі, Кастусь Рамановіч і гэтак далей. На бога спадзявайся, а сам не пасуй! Хто яго ведае, што здарыцца ў будучым.

Пра што ж гавораць гэтыя «кампетэнтныя» знаўцы Савецкай Беларусі і адмысловыя саветнікі тых, каму яны цяпер пакляліся служыць верай і праўдай? Вядома пра «заняпад» савецкай эканомікі, «правалы» ў сельскай гаспадарцы. Робіцца гэта вельмі проста. Скажам, з'явілася ў беларускай газеце заметка, што ў адным калгасе зацягваецца ўборка льну. Тут ужо ёсць чым пажывіцца! «Спецыяліст» па эканоміцы дойдзе да такіх «высноваў», што 10 амерыканскіх шэфаў і наглядальнікаў да гэтага не дадумаюцца: «Браткі, паглядзіце, дык калгасны лад не апраўдаў сябе». А інакш і не напішаш. Ад узроўню фантазіі залежыць і ўзровень аплаты.

Есць некалькі чалавек на радыёстанцыі, якія «спецыялізуюцца» на творчасці беларускіх пісьменнікаў. Метад гэткі ж самы—вышукваць у творах тыя мясціны, дзе ёсць крытыка асобных з'яў у нашым жыцці, у тым ліку фактаў цеганіны, праяў бюракратызму, дзе асуджаецца той ці іншы герой за свае ўчынкі. З гэтых «вытрымак» іншы раз рыхтуецца радыёперадача і робіцца, безумоўна, такі вывад: у Савецкай Беларусі спеюць сілы, якія нездаволены «савецкім рэжымам» і Камуністычнай партыяй...

Часцей за ўсё на літаратурныя тэмы выступаюць Станіслаў Станкевіч, той самы, што быў бургамістрам Барысава ў часы гітлераўскай акупацыі, а таксама Кастусь Рамановіч і Арцём Загорны. Апошнія працягваюць яшчэ сарамліва хавацца за псеўданімамі.

Былы гітлераўскі бургамістр называе цяпер сябе прафесарам, доктарам навук і час ад часу дае «дапытлівым» работнікам радыёстанцыі «Свабода» інтэрв'ю, як найбольш «аўтарытэтны» знаўца літаратурных спраў Беларусі.

У Кастуся Рамановіча ёсць свая ўлюбёная тэма. Ен больш за ўсё выступае «з нагоды ўгодкаў» таго ці іншага пісьменніка, асабліва, што датычыць рэабілітаваных. Нядаўна ён з пачцівасцю гаварыў пра «Менскую газэту», што выдавалася гітлераўцамі ў гады акупацыі ў Мінску. Яна, маўляў, аддала даніну павагі Уладзіміру Хадыку. Ен нават адважыўся цяпер упікнуць гітлераўцаў за тое, што яны знішчылі жонку паэта ў гета.

Можна падумаць, што гэта сумленны, крыштальна чысты чалавек, які дбае адно пра справядлівасць. Але давайце заглянем у падшыўку той жа «Менскай газэты» і іншых брудных лісткоў, што выдавалі гітлераўцы ў час акупацыі. Проста вачам сваім не хочацца верыць: ледзь не ў кожным нумары артыкул ці верш за подпісам таго ж самага Кастуся Рамановіча, ці, як тады ён «менаваў» сябе, — Рыгора Крушыны. І ў ніводным артыкуле, карэспандэнцыі ці вершы ні слова папроку ў адрас акупантаў, якія штодзень вешалі і расстрэльвалі савецкіх людзей, сагналі ў гета ўсіх яўрэяў і ўчынілі над імі крывавую расправу. Наадварот, ён, Рыгор Крушына, заклікаў не шкадаваць ні кудь, ні шыбеніц для савецкіх людзей, спяваў алілуя Гітлеру і яго «зялезным» салдатам, якія, маўляў, «прынеслі вызваленне і далучаюць Беларусь да новай Еўропы», выхваляў акцыі, якія праводзяцца «мужнымі гадаванцамі Гітлера супраць яўрэйскага насельніцтва». «Арыйская нацыя павінна стаць нацыяй пануючай», — пісаў ён. У гэтых словах усё нутро чалавека, які не толькі зрокся сваёй Радзімы, свайго народа, але прысягнуў на вернасць нашым лютым ворагам.

Дарэчы, тыя, хто блізка ведаў у час гітлераўскай акупацыі цяперашняга «экзыльнага літаратуразнаўцу» Кастуся Рамановіча, расказваюць, што калі ён часам і балюча перажываў, дык толькі з-за таго, што яго маці аказалася такой непрадбачлівай і запісала сына на бацькава прозвішча—Казак, а не на сваё—Бітрых. Ен абіваў парогі нямецкіх устаноў, даказваючы, што ён не беларус, а чыстакроўны немец — арыец. Маці ж яго немка. А бацька, ну, што з таго, што ён выпадкова аказаўся беларусам. Яго, Рыгора Казака, ветліва выслухоўвалі і гаварылі:

— Трэба даказаць справай.

І Рыгор Казак, ён жа Рыгор Крушына, ці сённяшні Кастусь Рамановіч, у 1942 годзе адправіўся на Случчыну, дзе пачаў выдаваць «Газэту Случчыны». Заадно «ачоліў», як ён любіў падкрэсліваць, акруговы дом гітлераўцаў і стаў штатным карэспандэнтам дзвюх газет і часопіса, што выдаваліся акупантамі ў Мінску. Яго выступленні зводзіліся да аднаго — «беларус той, хто ўсяго сябе аддае вялікай Германіі». А Гітлер (паводле яго слоў) — «чалавек, якому павінны ўсе беларусы быць удзячныя ўсё жыццё». Рэдактар «Газэты Случчына» любіў друкаваць фота, на якіх былі відаць папяліішчы нашых вёсак і трупы закатаваных землякоў. Ці не за гэта заклікаў беларусаў Рыгор Казак быць удзячнымі ўсё жыццё Гітлеру?

Тое, што нейкі Рыгор Казак з-пад Слуцка ў цяжкія дні для Беларусі стаў здраднікам, дамогся таго, што гітлераўскія хаўрусніки прызналі яго за свайго «арыйца», наўрад ці здзівіць каго-небудзь, хто яго ведаў раней, сустракаўся з ім. Многія сведчаць, як гэты слізняк, нейкі час ацираючыся ля Саюза пісьменнікаў, заводзіў з аблюбаванай ахвярай размовы на антысавецкія тэмы, і пасля гэтага чалавек раптоўна знікаў. Кажуць, што Рыгор Казак выхваляўся перад гітлераўцамі, што ў свой час саслужыў нядрэнную для іх службу. Кажуць, што лёс, які напаткаў Уладзіміра Хадыку,— справа рук старога правакатара. І калі ён вырашыў успамініць яго імя, то, вядома, не ад згрызоты сумлення. Носам сваім адчуў, што настаў час, калі і на мёртвых можна нажыць капітал, пагрэць свае рукі ля хлебадаўцаў. Такая ўжо душа і нораў гэтага адшчапенца і прайдзісвета.

Здзіўляе іншае. Як гэта яго і многіх іншых гітлераўскіх недабіткаў і прыстасаванцаў пыгрэлі тыя, што нядаўна яшчэ кляліся зрабіць усё для таго, каб вынішчыць фашызм і парасткі, якія ён пусціў.

Рыгор Казак можа па-ранейшаму хавацца пад чужымі прозвішчамі, але нішто не змые яго цёмнага мінулага, яго віну перад беларускім народам. Станіслаў Станкевіч можа начапіць сабе яшчэ дзесятак розных тытулаў і званняў, але ніякі час і ніякія заслугі перад новымі гаспадарамі не змыюць з яго рук крыві звыш дзесяці тысяч яўрэяў, у забойстве якіх ён прымаў удзел у Барысаве. Перада мною ляжаць фотакопіі дакументаў, якія лепш за ўсё характарызуюць гэтага гітлераўскага бандыта: акт, падпісаны Станіславам Станкевічам аб перадачы нямецкім уладам залатых зубоў і каронак, вырваных у закатаваных; данясенні аб «паспяхова праведзеных карных акцыях», колькасці забітых і адпраўленых на нямецкую катаргу юнакоў і дзяўчат з Барысаўскага раёна і Баранавіцкай акругі, дзе ў перадапошнія дні акупацыі Станіслаў Станкевіч займаў пасаду намесніка Астроўскага. Вядомая прымаўка гаворыць: скажы, хто твой сябар, і я скажу, хто ты. Калі знаёмішся з пасажным спісам гэтых заўзятых гітлераўскіх паслугачоў, то больш поўна раскрываецца і аблічча тых, у каго знаходзяцца яны цяпер на службе. Разам з тым узнікае пытанне: ці ведаюць радавыя, сумленныя амерыканцы, каго прыгрэлі іх кіраўнікі, ці здагадваюцца жыхары Мюнхена, якое асінае гняздо знаходзіцца ў доме пад нумарам 46/48 на вуліцы Дахаўштрасэ, і што за людзі знайшлі там прытулак?

Той факт, што забойцы і здраднікі сталі паважанымі і даверанымі асобамі ў многіх амерыканскіх дзяржаўных установах, хіба не выклік усяму чалавецтву? Хіба гэта не абраза Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, якая ў лютым 1946 года прыняла рэзалюцыю аб выдачы і пакаранні ваенных злачынцаў? Вось пра што хочацца спытацца ў нашых нядаўніх саюзнікаў.

А. СТУК.

З нашай пошты

АБЯЦАНКІ-ЦАЦАНКІ...

Я часта бываю ў Быхаўскім раёне і заўсёды цікаўлюся навінкамі літаратуры. На жаль, новыя кнігі ў сельмагі завозяцца вельмі рэдка. У Ісканскім і Сялецкім магазінах мастацкай літаратуры на вітрынах не ўбачыш. На паліцах яе таксама небагата. Аб гэтым я напісаў у быхаўскую газету «Маяк Прыдняпроўя».

Мінула нешта каля года, як заметка была надрукавана. Цяпер у Ісканскім магазіне працуе другі загадчык, але адносіны да кніжак па-ранейшаму не змяніліся. Старшыня праўлення Абідавіцкага сельпо тав. Ліхтароў абяцае, што кнігі паступяць у магазіны ў бліжэйшы час.

Абяцанкі-цацанкі... А жыхарам вёскі няма дзе набыць кнігу.

Васіль ТКАЧОЎ.

Рагачоўскі раён,
в. Гута.

З КАНЦЭРТАМ НА ЛЫЖАХ

Удзельнікі мастацкай самадзейнасці Мінскага інстытута замежных моў выйшлі ў лыжны агітпаход, прысвечаны XXIII з'езду КПСС. Яны павезлі ў вёскі Капыльскага раёна канцэртную праграму, складзеную з лірычных песень, танцаў народаў СССР, сатырычных сцэнак, баек і інтэрмедый.

У складзе канцэртнай брыгады ёсць свой паэт і мастак — студэнт Д. Юдовіч. Студэнты будуць выконваць частушкі, складзеныя на мясцовым матэрыяле, выпускаць насценныя сатырычныя лісткі. Самадзейныя артысты дадуць сем канцэртаў у вёсках калгасаў «Бальшавік», «Гвардзеец», «Семежава», імя Войкава, імя Дзяржынскага, сустрэнуцца з сельскімі старшакласнікамі.

В. БАРЫСЕВІЧ.

Дом, поўны музыкі, — так у Смаргоні называюць музычную школу. Зранку і да вечара адсюль даносяцца вясёлыя пераборы баяна, пяшчотныя гукі скрыпкі, іграюць пявучыя цымбалы. Каля ста дзяцей рабочых, калгаснікаў, служачых вучацца ў гэтай школе. На здымку вы бачыце юных цымбалістаў Галю Радзевіч, Валодзю Дубіцкага і Алену Шырокаву. Вядзе заняткі выкладчыца Любоў Тарасава.

Фота Ул. КРУКА.

ПРА ТЫХ, КАГО НЕ БАЧЫЦЬ ГЛЯДАЧ.

МАШЫНІСТ СЦЭНЫ

Тэатральнае мастацтва — перш за ўсё мастацтва акцёра, але адзін акцёр або адны акцёры — яшчэ не тэатр. Яго складае вялікая група работнікаў. Пра некаторых з іх у рэдкіх газетных і часопісных артыкулах прынята пісаць пад рубрыкаю «Пра тых, каго не бачыць глядач». А тыя, «каго не бачыць глядач», увасабляючы задумы пастаноўшчыка, сваёй працаю памагаюць акцёрам у спектаклі захоўваць творчае самаадчуванне, неабходнае для найбольш поўнай перадачы ўнутранага жыцця вобраза, а гледачам паўней і глыбей адчуваць усё багацце і складанасць гэтага жыцця.

З асаблівым пачуццём павагі і падзякі калектыў Тэатра імя Янкі Купалы адзначае шасцідзесяцігоддзе свайго таварыша і сябра Міхаіла Іванавіча Пржыбыткі.

Нялёгкі быў шлях Міхаіла Іванавіча ад работніка сцэны да галоўнага мащыніста сцэны Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы.

Вось ужо сорак гадоў аддае ён сваю працу нашаму тэатру, дзеліць з ім радасць поспехаў і горыч няўдач. Добрасумленна працуе ён на складаным участку тэатральнай работы. Высокі прафесіяналізм і добрыя арганізатарскія здольнасці, патрабавальнасць да сябе і да ўзначальваемага ім калектыву манціровачнага цэха вызначаюць яго работу, і тэатр у вялікай ступені абавязаны Міхаілу Іванавічу сваім поспехам у развіцці вонкавай сцэнічнай культуры.

Вялікую і адказную работу камуніст М. Пржыбытка паспяхова спалучае з удзелам у грамадскім жыцці тэатра.

Праца Міхаіла Іванавіча неаднаразова адзначалася ўрадавымі ўзнагародамі.

Шэсцьдзесят гадоў! Гэта і многа і вельмі мала...

Многа, калі гэтыя шэсцьдзесят пражыты чалавекам без радасці, без упэўненасці ў тым, што справа яго патрэбна людзям. І вельмі мала, калі гаворка ідзе пра чалавека, які пражыў гэтыя гады паўнакроўным жыццём, аддаючы свае фізічныя і духоўныя сілы на карысць свайго народа, калі гэтыя гады адзначаны бязмежнай любоўю да справы, да таварышаў па творчай працы.

Пройдзены працоўны шлях — зарука таму, што, поўны сіл, энергіі і любві да тэатра, Міхаіл Іванавіч прынясе яшчэ нямала карысці гэтай справе, якой аддаў ужо сорак гадоў жыцця.

А. ГРЫГАР'ЯНЦ,
галоўны мастак Тэатра імя Я. Купалы, заслужаны дзеяч мастацтва БССР.

ГЛЯДАЧ—УДЗЯЧНЫ

Жыхары вёсак Хомічы, Ракаў, Касетава і іншых у Калінкавіцкім раёне заўсёды рады прыезду кінамеханіка Уладзіміра Сянько. Яны ведаюць, што яго не затрымаюць ні слата, ні мяцеліцы.

Вось ужо 15 гадоў Уладзімір працуе кінамеханікам на сяле. Ен штомесячна перавыконвае план, умела дэманструе фільмы, перад пачаткам кінасеанса знаёміць гледачоў са зместам новай кінакарціны.

Так працуюць многія сельскія кінамеханікі. Рыгор Сергіенка абслугоўвае шэсць вёсак. У кожнай з іх ён жаданы госць. Цёпла гавораць жыхары вёскі Бярозаўка аб кінамеханіку Міхаіле Пацею.

Лепшым кінафікатарам уручаны граматы раённага аддзела культуры. Але самая лепшая ўзнагарода для іх—удзячнасць гледача.

БЕЛТА.

СУМАВАЦЬ НЕ ДАВОДЗІЦЦА

У брыгадах калгаса імя Янкі Купалы Маладзечанскага раёна можна часта бачыць такія аб'явы: «Запрашаем сёння ў клуб. Адбудзецца канцэрт. Пачатак у 19 гадзін».

Канцэрт мясцовых самадзейных артыстаў тут звычайная з'ява. Ініцыятарамі гэтай добрай справы сталі калгасныя камсамольцы, моладзь. На адным са сваіх сходаў яны так і сказалі: арганізаваць культурны адпачынак калгаснікаў — наша справа. Перш за ўсё было вырашана стварыць гурткі.

Сярод даяран, ільнаводаў, механізатараў знайшліся танцоры, дэкламатары, спевакі, аматары драматургіі. На дапамогу калгаснай самадзейнасці прыйшлі работнікі Палачанскага сельскага Дома культуры.

За апошнія месяцы палачанскія самадзейныя артысты ва ўсіх населеных пунктах калгаса далі больш 30 канцэртаў. Здараецца, што яны выязджаюць і ў суседнія гаспадарні.

Я. ГУРЫНОВІЧ.

ПА ПРАВУ ЧЫТАЧА І КРЫТЫКА

Дзмітрый БУГАЕЎ

Міхась СТРАЛЬЦОЎ
ЖЫЦЦЁ У СЛОВЕ
«Беларусь»
1965

Малады празаік Міхась Стральцоў у канцы мінулага года выдаў свой першы зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў «Жыццё ў слове». У прадмове да кнігі аўтар падкрэслівае: «Мне хацелася сказаць пра сваё захапленне працай тых, хто стварыў сённяшнюю славу нашай літаратуры. Сказаць можа не столькі па праву крытыка, а найбольш па праву ўдзячнага, шчырага і зацікаўленага чытача».

Заява сціплая, хаця ў зборніку ёсць асобныя артыкулы, якія сапраўды напісаны з пункту гледжання чытача. Я маю на ўвазе перш за ўсё артыкул «Дудар беларускі», прысвечаны Францішку Багушэвічу. Чытаючы гэтыя нататкі цікава, бо яны напісаны свежа, усхвалявана і неяк вельмі асабіста, з глыбокім разуменнем трагедыі паэта, якому давялося сутыкнуцца ў сваёй пісьменніцкай справе з неймавернымі цяжкасцямі. Аднак уласна даследчыцкага падыходу тут яшчэ няма.

Пэўны спецыфічна чытацкі прыцэл у той ці іншай меры адчуваецца і ва ўсіх іншых артыкулах зборніка. Зноў жа, само па сабе гэта зусім нядрэнна. Бо ўменне быць зацікаўленым, але непрадузятым чытачом, здольнасць па-чалавечы захапляцца мастацкім творам, захоўваючы непасрэднасць успрыняцця, з'яўляюцца, безумоўна, неабходнымі для любога крытыка.

Міхась Стральцоў умее быць удумлівым і зацікаўленым чытачом, але рэдка, вельмі рэдка застаецца **толькі** чытачом. Ён мае ўсе якасці, неабходныя прафесіянальнаму крытыку. І таму не будзе ніякага перабольшання сказаць, што яго кніжка напісана не толькі па праву ўдзячнага чытача, але і па праву разумнага, таленавітага крытыка. Высокі эстэтычны густ, дасканалае адчуванне мастацкага слова спалучаюцца ў аўтара з добрым веданнем беларускай мовы; досыць грунтоўная дасведчанасць у розных галінах літаратуразнаўчай навукі ідзе поруч з вялікай патрабавальнасцю, а сапраўдная зацікаўленасць пісьменніцкімі справамі, даволі дакладнае разуменне надзённых патрэб сённяшняга літаратурнага развіцця шчасліва дапаўняюцца тонкай крытычнай назіральнасцю.

Характэрна, што нават там, дзе Міхась Стральцоў піша як чытач, выказваючы свае ўражанні ад тых мастацкіх з'яў, што ўвогуле ўжо дастаткова глыбока даследаваны, у яго разважаннях у большасці выпадкаў выразна адчуваецца логіка арыгінальнага крытыка. Так, артыкул «На пачатку ўсіх пачаткаў» у цэлым напісаны з пазіцыі чытача. Тут хоць і досыць цікава, па-свойму, але гаворка вядзецца пра вядомыя рэчы — пра агульнае значэнне твораў Янкі Купалы, Якуба Коласа і Максіма Багдановіча для лёсу беларускай нацыянальнай культуры. Але вось аўтар закранае вельмі канкрэтнае пытанне аб уплыве сімвалізму на паэзію Багдановіча. І за ўсхваляваным чытачом паўстае праніклівы, уважлівы даследчык. Ён умее не толькі перадаць сваё гарачае захапленне паэтам, але і па-новаму асэнсаваць яго паэзію ў гістарычным аспекце, замахнуўшыся пры гэтым на даўнюю і трывалую крытычную традыцыю, якая звычайна папракала Багдановіча сімвалізмам.

Мала сказаць, што думка маладога крытыка зусім слушная. Мы чуем пераканаўчы і ўпэўнены голас дасведчанага літаратуразнаўцы, які не слізгае на паверхні фактаў, а глядзіць у корань рэчаў, пранікае ў іх сутнасць, бо мысліць канкрэтна-гістарычна. Гэта і дае яму магчымасць заўважаць нешта новае і тады, калі даводзіцца звяртацца да пытанняў і праблем, якія маюць сваю працяглую гісторыю.

Яшчэ лепш даследчыцкія якасці Міхася Стральцова выявіліся ў артыкулах «Прысвячаецца радасці» і «Па нятораной сцежцы». У першым з іх аўтар узяў, здавалася б, ужо «задаследаваны» матэрыял — раннія апавяданні Кузьмы Чорнага. Як вядома, пра творчасць гэтага пісьменніка ёсць не толькі шмат добрых артыкулаў, але і тры грунтоўныя кніжкі — І. Кудраўцава, А. Адамовіча, М. Луферава. І ўсё ж Стральцоў здолеў сказаць новае і цікавае слова пра выдатнага майстра беларускай эпічнай прозы. Ён добра паказаў, што яшчэ многа неадкрытага ёсць там, дзе на першы погляд усё здаецца зразумелым, ясным і простым і не патрабуе асаблівых даследчыцкіх намаганняў.

Артыкул «Прысвячаецца радасці» паказальны і ў тым сэнсе, што ён перасцерагае даследчыкаў ад своеасаблівага гіпнозу пісьменніцкіх імён. Гутарка ідзе пра тую распаўсюджаную завядзёнку, калі пад уплывам сапраўды выдатных твораў славутага мастака вяршыняй дасканаласці абвяшчаецца ўсё, што выйшла з-пад пяра гэтага аўтара. Так у разрад шэдэўраў часамі трапляюць далёкія ад мастацкай бездакорнасці, слабыя ці проста нават вучнёўскія творы, якія могуць быць у любога, самага таленавітага пісьменніка. Аналізуючы некаторыя найбольш раннія чорнаўскія вопыты ў галіне апавядання, Міхась Стральцоў падкрэслівае, што такая ўраўнілаўка, хаця яна звычайна грунтуецца на добрых намерах, не садзейнічае ні аўтарытэту літаратуры, ні аўтарытэту яе вядомых майстроў.

У артыкуле «Па нятораной сцежцы» крытык пераканаўча асвятляе наватарства Цішкі Гартнага, яго тэматычнае першаадкрывальніцтва, з веданнем справы гаворыць пра тую ролю, якую адыгралі «Сокі цаліны» і наогул уся творчасць іх аўтара ў адлюстраванні рабочага жыцця, гарадскога побыту, а таксама ў развіцці выяўленчых магчымасцей беларускай літаратурнай мовы. Кіруючыся дыялектычна-гістарычным прынцыпам, даследчык глыбока вытлумачвае і супярэчнасці творчай практыкі гэтага пісьменніка, уласцівыя яму сур'ёзныя недахопы, і зусім правамерна звязвае іх не толькі з асаблівасцямі таленту пісьменніка, але і з агульным станам тагачаснага літаратурнага працэсу, у якім выразна адчуваліся недастаткова высокая апавядальная культура, нераспрацаванасць празаічных плыняў і стыляў, асабліва стылю, звязанага з паказам горада, жыцця рабочага класа.

Імкненнем даць арыгінальныя творчыя характарыстыкі, вылучыць галоўнае ў мастацкім вобліку кожнага аўтара звяртаюць на сябе ўвагу артыкулы «Прыход сталасці», «Душэўная думка паэта», «Сярод добрых людзей». Тут крытык аналізуе творчасць Аляксея Зарыцкага, Аляксея Русецкага, Піліпа Пестрака. Аўтару ўдалося добра прасачыць, як нялёгка ішоў да сваёй пісьменніцкай сталасці А. Зарыцкі, паэт, які, на думку даследчыка, дасягнуў найбольш поспехаў у жанры эпічнай паэзіі. Удача прыходзіла да Зарыцкага тады, калі аб'ектывізавана-апавядальная аснова яго твораў арганічна ўзбагачалася мяккімі лірычнымі і гумарыстычна-сатырычнымі інтанацыямі («Аповесць пра залатое дно»).

Праўда, гэтая думка грунтуецца на вядомым выказванні Мікалая Ціханава. Аднак Стральцоў не проста запазычвае трапнае агульнае вызначэнне, зразумела, спасылаючыся на аўтара. Ён напаўняе ўзятую формулу жывым зместам, здабытым у выніку самастойнага даследавання паэзіі Аляксея Зарыцкага. Напрыклад, вельмі цікава, канкрэтна разглядае крытык сам характар лірызму ў розных творах паэта.

Звярнуўшыся да паэзіі А. Русецкага, пра якога, дарэчы сказаць, як і пра А. Зарыцкага, у нас амаль нічога сур'ёзнага яшчэ не напісана, Міхась Стральцоў знаходзіць іншыя вызначальныя рысы яго творчасці. Стрыманасць у выказванні пачуццяў, ашчаднасць у слове, схільнасць да развагі, да «нейкага як бы навуковага даследавання жыцця», уменне дыялектычна, інтэлектуальна асэнсаваць сувязі чалавека «з асяроддзем, прыродай, грамадствам, гісторыяй»— вось чым у першую чаргу ўражвае даследчыка Русецкі — паэт думкі, якая не вядзе да рацыяналізму тады, калі яна становіцца душэўнай думкай аўтара.

У Піліпа Пестрака крытыка асабліва прываблівае вялікая жыццялюбнасць, душэўная цэльнасць і раўнавага, уменне паэтызаваць станоўчае ў характары людзей, «замілаванне і любоў, добрае здзіўленне перад душой і розумам чалавека, перад тым светам, у якім ходзіць ён і які ўмее ўпрыгожыць сабой, дадаць яму часцінку свайго характара, «ачалавечыць» яго».

Вядома, у асобных выпадках можна спрачацца адносна таго, ці вычэрпваюць гэтыя характарыстыкі ўсё багацце творчай індывідуальнасці пісьменнікаў, бо ўсякае вызначэнне, схопліваючы толькі галоўнае, у нейкай меры непазбежна збядняе непаўторнасць жывой з'явы. Аднак бясспрэчна тое, што характарыстыкі, якія дае крытык таму ці іншаму мастаку, не з'яўляюцца адвольнымі або выпадковымі. Яны не накладваюцца на пісьменніка як нейкая звыклая, станоўча-стандартная сетка, што сваёй агульнасцю толькі зацямняе індывідуальнае ў творчым вобліку, уніфікуючы, ніведіруючы розныя мастацкія натуры. У М. Стральцова індывідуальна-творчыя характарыстыкі пісьменнікаў вызначаюцца акрэсленасцю і пэўнай адметнасцю, непаўторнасцю. Яны адлюстроўваюць істотнае ў мастацкай манеры аўтараў, бо вынікаюць з канкрэтнага крытычнага аналізу ці, прынамсі, падмацоўваюцца гэтым аналізам і таму становяцца дастаткова змястоўнымі ў кожным канкрэтным выпадку. Вось чаму гэтыя вызначэнні не могуць быць пераадрасаваны любому больш-менш прыкметнаму мастаку, як гэта бывае ў тых крытыкаў, што не маюць жывога мастацкага чуцця і таму абыходзяцца агульшчынай, якая з-за сваёй стандартнай правільнасці мае вельмі шырокі дыяпазон прымянення, але, як і ўсякая стандартная мерка ці дэталь, не можа перадаць нешта спецыфічна індывідуальнае, своеасаблівае.

Шырокае кола літаратурных праблем, у тым ліку найбольш актуальных, закранаецца ў артыкулах «І пайшоў дарогай росту...», «Герой у шарачковай світцы». Тут Стральцоў дзеліцца сваімі цікавымі нагляданнямі пра поспехі і пэўныя пралікі сучаснага беларускага рамана (артыкул «І пайшоў дарогай росту...»). Аўтар надта слушна гаворыць пра неабходнасць далейшага развіцця беларускай літаратурнай мовы, асабліва тых яе пластоў, якія павінны перадаваць адцягненыя, абстрактна-разумовыя паняцці пра важнасць наватарства ў літаратуры сацыялістычнага рэалізму, пра небяспеку эпігонства і архаічнасці для пісьменнікаў, якія не столькі развіваюць здабыткі папярэдняй літаратуры, колькі займаюцца «паўтарэннем пройдзенага», пра важнасць клопатаў аб пашырэнні сферы мастацкага даследавання жыцця, нарэшце, пра вельмі патрэбнае імкненне да стылявой шматграннасці мастацтва (артыкул «Герой у шарачковай світцы»).

Аднак у гэтым артыкуле, нягледзячы на ўсе шматлікія агаворкі і ўдакладненні крытыка, заўважаецца некаторая аднабаковасць, у прыватнасці, адчуваецца залішняя насцярожанасць у дачыненні да традыцыйна-бытавога стылю беларускай прозы, наяўнасцю якога Міхась Стральцоў схільны тлумачыць нават тое, што ў празаіка Уладзіміра Карпава няма выразнага, арганічнага стылявога адзінства. Але ў гэтым, думаецца, больш вінаваты сам Карпаў, чым беларуская мова, усе тонкасці якой не даюцца пісьменніку.

Папракаючы некаторых аўтараў за іх празмерную ўвагу да асаблівасцей гутарковай мовы, крытык робіць закід, што гэта найчасцей мова вясковага насельніцтва, «не зусім прымальная, а то і недарэчная пры адлюстраванні сфер жыцця і з'яў, далёкіх ад вёскі». Але тут ужо не віна, а бяда беларускіх літаратараў, бо, за рэдкімі выключэннямі, на беларускай мове штодзённа гавораць толькі вясковае насельніцтва ды некаторыя пласты інтэлігенцыі, якая канчаткова не парвала сваёй сувязі з вёскай ці па характары працы звязана з беларускай мовай. Гэтая з'ява, вядома, ненармальная, але не пісьменнікі яе стварылі. І адны яны не могуць істотна змяніць становішча, хаця сапраўды павінны больш клапаціцца пра моўнае багацце сваіх твораў, чэрпаючы скарбы з усіх даступных крыніц, ствараючы тыя лексічныя сродкі, якіх нестае ў нашай літаратурнай і народнай мове.

Думаецца, што ў кнізе Міхася Стральцова «Жыццё ў слове», паставіўшы сабе адпаведную мэту, можна аспрэчваць і некаторыя іншыя прыватныя палажэнні і сцвярджэнні. Мне ж хацелася больш звярнуць увагу на арыгінальнасць працы маладога крытыка, на змястоўнасць яго першай кніжкі, якая, хочацца спадзявацца, знойдзе сваю дарогу да сэрца зацікаўленага чытача. Для гэтага ёсць усе падставы.

Вокладкі новых кніг, якія выйшлі ў выдавецтве «Беларусь», — «Сустрэча з Леніным» І. Шамава, «Урачыстая песня» К. Кірэнкі, «Майя» К. Буйлы, «Не на сваім месцы» Ул. Корбана, «Лішнія» Дантэ Арфелі (пераклад з італьянскай мовы А. Шаўні).

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Ул. КОРБАН. Не на сваім месцы. Байкі, вершы. Мастак М. Гурло. 1966 г. Тыраж 5 тыс. экз., стар. 128. Цана 23 кап.

А. АЛЕШКА. Над намі мільён вышыні. Аповесць. 1965 г. Тыраж 6 тыс. экз., стар. 284. Цана 44 кап.

І. КУБІЧАК. Люцынка. Раман. Пераклала з чэшскай мовы В. Крайко. Мастак Б. Малкін. 1966 г. Тыраж 4 тыс. экз., стар. 344. Цана 58 кап.

С. ГРАХОЎСКІ. Вася Весёлкін ляціць на Месяц. Вершы. На рускай мове. Для дашкольнага ўзросту. Малюнкі А. Волкава. 1966 г. Тыраж 100 тыс. экз., стар. 16. Цана 16 кап.

Мастацкая самадзейнасці. Творы для духавога аркестра. Склаў М. Трахтэнберг. 1966 г. Тыраж 400 экз., стар. 80. Цана 60 кап.

«БЕЛАВЕЖА», НУМАР ПЕРШЫ

Пры беластоцкім штотыднёвіку «Ніва», які выдаецца Галоўным праўленнем Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы, ужо восьмы год існуе літаратурна-мастацкае аб'яднанне «Белавежа». У яго ўваходзяць больш дваццаці аўтараў, якія жывуць і працуюць не толькі на Беласточчыне, але і ў Варшаве, на Познаншчыне, на Заходніх землях. Свае творы члены аб'яднання друкуюць у «Літаратурнай старонцы» штотыднёвіка «Ніва», а таксама ў штогадовых «Беларускіх календарах». Апрача таго выйшаў калектыўны зборнік паэзіі «Рунь». Станоўчую ацэнку чытачоў і друку атрымалі таксама першыя зборнікі вершаў А. Барскага «Белавежскія матывы» і Я. Бурша «Прамень думкі».

У канцы 1965 г. у Беластоку быў выпушчаны першы нумар альманаха беларускіх пісьменнікаў, якія жывуць у народнай Польшчы. Як і само аб'яднанне, ён называецца «Белавежа». У першым нумары альманаха творы дваццаці двух паэтаў і празаікаў. Гэта людзі розных прафесій, розных творчых манер. Адны з іх працуюць непасрэдна ў «Ніве», другія настаўнічаюць, трэція заняты грамадскай дзейнасцю, чацвёртыя вучацца, пятыя займаюцца сельскай гаспадаркай. Пераважная большасць аўтараў мае вышэйшую адукацыю, а некаторыя з іх вучыліся ў савецкіх універсітэтах і інстытутах (Мікола Гайдук, Сымон Раманчук, Дзмітрый Шатыловіч).

Першы нумар альманаха адкрываецца творамі аднаго з найбольш таленавітых беларускіх пісьменнікаў у Польшчы, выкладчыка кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта Алеся Барскага (Аляксандра Баршчэўскага). Ён нядаўна быў прыняты ў Саюз польскіх пісьменнікаў, неаднаразова гасцяваў у Савецкай Беларусі. У альманаху змешчаны некалькі вершаў А. Барскага, яго камедыя «Гарадскія госці», якая ў свой час заняла першае месца на конкурсе Галоўнага праўлення БГТК, а таксама байка «Ліса, воўк і мядзведзь», апавяданні «Лянарда», «Кроў» і «Вечарынка». Творы А. Барскага прысвечаны пераважна роднай Беласточчыне, яе людзям, яе маляўнічым краявідам. У вершах паэта гучыць гарачая любоў да сваёй бацькаўшчыны, да той зямлі, з якой ён увабраў «сокі роднай глебы і пахі хлеба, і водар лугу». Кранае чытача таксама любоўная лірыка А. Барскага.

У першым нумары «Белавежы» багата прозы. Маладых празаікаў хвалююць пераважна дзве тэмы—апошняя вайна і будаўніцтва сацыялістычнага грамадства ў Польшчы. Глыбінёй псіхалагічнага аналізу, вастрынёй маральна-этычных канфліктаў вызначаюцца апавяданні «Воўчы след» Міколы Лобача, «Пралеска» Вінцука Склубоўскага, дзе ўзнімаецца тэма адказнасці за злачынствы, зробленыя ў час фашысцкай акупацыі. Цікавы вобраз жанчыны-працаўніцы, якая жыве ў сучасным беластоцкім кааператыве, стварыў у апавяданні «Чаканне» журналіст Віктар Рудчык. Прыемна адзначыць, што амаль ва ўсіх празаікаў намячаецца свая тэма, уласная творчая манера. Востра і дасціпна высмейвае адмоўныя з'явы Юрка Геніуш («Як знайсці хулігана?»). Пра высакародпасць і дабрату простага вясковага чалавека піша Сымон Раманчук. Вясковыя анекдоты цікава пераказвае С. Заставін. Паэтызаваць успаміны дзяцінства ўмее Уладзімір Паўлючук. Да абагульненняў узнімаецца ў сваіх лірычных і сатырычных мініяцюрах Сакрат Яновіч. Свой творчы почырк асабліва адчуваецца ў апавяданнях Міколы Гайдука і Антося з Лепля. Першы з іх, адштурхоўваючыся ад паасобных радкоў Іпацьеўскага летапісу, вядзе чытача ў Беларусь часоў феадальнай раздробленасці. У апавяданні «Шляхецкія госці» Антось з Лепля (Антон Васілеўскі) каларытна апісвае трагікамічны побыт былой засцянковай шляхты на Дзісненшчыне.

Далёка не ўсе апавяданні альманаха раўназначныя ў мастацкіх адносінах. Ёсць сярод іх творы рытарычныя, прамалінейныя, апісальныя. Некаторыя напісаны невыразнай, бледнай мовай. Але сярод іх няма твораў графаманскіх і твораў абывакавых. І гэта—добра.

Тое ж самае можна сказаць пра паэзію «Белавежы». Апрача А. Барскага яна прадстаўлена імёнамі Янкі Бурша, Уладзіміра Гайдука, Юркі Зубрыцкага, Алеся Свіська, Дзмітрыя Шатыловіча, Івана Чыквіна, Віктара Шведа і інш. Усе яны спрабуюць знайсці ўласны голас. Ускладнёную асацыятыўную лірыку Янкі Бурша не зблытаеш з пейзажнымі замалёўкамі Уладзіміра Гайдука, вершы на касмічныя тэмы Юркі Зубрыцкага — з грамадзянскай лірыкай Віктара Шведа. Для іх твораў уласціва адчуванне высокай грамадзянскай адказнасці, пачуцці любві да сваёй сацыялістычнай радзімы, да роднага краю і роднай мовы.

Дзе б я ні быў, заўсёды я з табою,
І да цябе заўжды мне сэрца б'е.
І кожнай ноччу льюцца, як ракою,
Сны аб табе, ды толькі аб табе,—

звяртаецца да роднай Беласточчыны Дзмітрый Шатыловіч. Сугучныя радкі мы знаходзім таксама ў вершах Алеся Свіська, Уладзіміра Гайдука, Віктара Шведа. Апошні ўсклікае ў вершы «Бацькоўскі парог»:

Дзе б толькі мяне лёс ні кінуў,
З далёкіх і блізкіх дарог
Заўсёды знайду пуцявіну
На родны бацькоўскі парог.

Вялікую цікавасць маюць змешчаныя ў канцы альманаха «Успаміны» Міхала Забэйды-Суміцкага. Гэта—мастацкая аўтабіяграфія вядомага беларускага спевака. М. Забэйда-Суміцкі ўсхвалявана расказвае пра сваё дзяцінства, якое прайшло ў глухой беларускай вёсцы Шэйпічах, пра вучобу ў Маладзечанскай семінарыі, жыццё ў Харбіне і Мілане, знаёмства з Рыгорам Шырмам і Максімам Танкам. З асаблівай цікавасцю чытаюцца тыя старонкі ўспамінаў, дзе вядомы спявак прыгадвае аб здзеках, якія яму прыйшлося цярпець з боку белапольскіх улад ды фашысцкіх акупантаў—усіх тых, каму прыйшлася не да спадобы беларуская песня.

Першы нумар альманаха ілюстраваны рэпрадукцыямі з твораў беластоцкіх мастакоў—удзельнікаў аб'яднання «Белавежа». Найбольш моцнае ўражанне робяць малюнкі гайнаўскага настаўніка Віктара Кабаца. Ён услаўляе прыгажосць Белавежскай пушчы. Свае «Рэфлексіі з Асвенціма» мастак прысвяціў памяці ахвяр фашызму.

Заканчваючы разгляд «Белавежы», хочацца пажадаць рэдкалегіі альманаха, каб яна не спынілася на першым нумары, а ператварыла альманах у добрае перыядычнае выданне, узбагаціла яго ў жанравых адносінах і больш патрабавальна ставілася да мастацкага ўзроўню публікуемых твораў.

А. МАЛЬДЗІС.

Алесь БАРСКІ

М. БАГДАНОВІЧУ

Паэт не патрабуе доўга жыць,
бо мог бы паўтарыць
адно і тое ж слова,
і перастаў бы быць паэтам,
і стаўся б падхалімам марным,
захопленым сваёю славай.
Ты гэта ведаў дасканала,
ты вычарпаў да дна
прыгожае
з крыніц,
з надзеі і бязвер'я,
і з радасці, і з смутку.
Іду я па тваіх слядах,
вачмі тваімі гляджу на свет
і бачу больш,
чым ў свеце ёсць.
З вялікім плакаць лепш,
чымсьці з малым смяяцца.
Дазволь мне паўтарыць
хоць частку
тваіх сумных слоў.

Алесь СВІСЁК

БЕЛАРУСКАЯ ПЕСНЯ

Спявала дзяўчына, мяжой ідучы.
Навокал было жыта і сонца праменні
і быў мак...
Загарэўся ў дзяўчыны серп на плячы,
а ў вачах васількі,
а твар — у натхненні.
А ў той песні быў жар,
і трывога — любоў...
Прытаіўся я,
вочы заплюшчыў...
І пачуўся мне шэпт елак, хвоек, дубоў,
і бяроз, і алешын наднёманскай пушчы.
Ручай і асіна заводзяць гаворку.
Заскрыпела сасна.
Заяц скочыў у гушчу.
З-за пня заблішчэлі вочкі вавёркі.
Недзе дзяцел застукаў,
кукавала зязюля,
над ракой на вярбе заспяваў салавей.
Пчолы з песняй займалі новы дом—дупло-вулей.
А над Нёманам луг — мора красак і траў.
Вока гіне у далі бясконцай.
Страказа тут і пчолы,
ціха чмель заіграў,
матылькі-красуны купаюцца ў сонцы.
Успорхнулі качкі.
Дзяркач закрычаў.
Адклікнуўся бусел з дуба...
А сонца ўсё свеціць,
а кветкі ўсё пахнуць!
А сэрцу так цёпла, так люба.
Я слухаў, глядзеў
і ўжо думаць пачаў:
«Эх, прысніўся мне сон, якіх мала!»
А гэта толькі
дзяўчына спявала,
дзяўчына з васількамі ў вачах
беларускую песню спявала.

Уладзімір ГАЙДУК

КОШЫК

Панясу на дарог прагаліны
Поўны кошык, прапахлы лесам.
Грыбы баравыя, паджарыя
Сваім выглядам дзяцей цешаць.

Кожны грыб у казку мяняецца,
Толькі слухаць і ўголас марыць,
Гараць вочы, жар разгараецца.
Грыб і казка ходзяць у пары.

І таму ў час вячэрніх мяцеліц,
Як пасядзем ля цёплай печы,
Казкі з кошыка нам грыбы дзеляць—
Ах, як добра ў хаце, здаецца.

Юрка ЗУБРЫЦКІ

НОВАЕ

Не згаджаюся я ў гэтым з многімі,
Новае — не з музыкай парад.
Скрытымі калонамі станогімі
Цягне нас мінулае назад.

Ведамі рубежнымі ахутаны,
Гойсаем з прывалу на прывал
І сябе, змагаючыся з культамі,
На гранітны ставім п'едэстал.

На наш век цяжкія часы выпалі:
У нябесных прыдарожных снах
Мёданоснымі, зямнымі ліпамі
Па-зямному садзім Млечны Шлях.

Віктар ШВЕД

БЕЛАРУСЬ

Ізноў знаёмыя мясціны,
Лясы, пасёлкі, гарады.
О, Беларусь, ты край гасцінны,
Край жыватворчы, малады.

Край з маляўнічаю прыродай,
Сваіх багаццяў уладар,
Край працавітага народа,
Край здзейсненых надзей і мар.

Мінск захапляе стройным станам
І ачароўвае сабой.
Зайздрошчу шчыра я мінчанам,
Сталіцы з юнаю красой.

Хоць я цябе ізноў пакінуў,
Хоць я сказаў табе — бывай!
Жывеш ты ў сэрцы, ва ўспамінах,
О, Беларусь, гасцінны край.



УРЫВАК З ТРЭЦЯЙ КНІГІ РАМАНА «ЗАСЦЕНАК МАЛІНАЎКА»

У трэцяй кнізе рамана «Засценак Малінаўка» паказаны далейшы лёс галоўных герояў твора — Андрэя Сташэвіча і Якава Шэмета. Я стараўся паказаць, як праламляюцца ў іх свядомасці падзеі руска-японскай вайны і рэвалюцыі 1905 года, які водгук знаходзяць гэтыя падзеі на Беларусі.

АЎТАР.

Паводка, запаланіўшы лугі, палеткі і лясы, цягнулася некалькі дзён. Нарэшце ўся вада спылала ў Случ. Невялікая ціхая рэчка не магла ўмясціць яе ў сваіх берагах і разлілася, затапіла ўвесь лугавы левы бераг аж да самага лесу.

Засцянковая вуліца, вызваліўшыся ад вады, ператварылася ў балота, не было на ёй ні пешага, ні коннага руху. Засцянкоўцы хадзілі адзін да аднаго цераз прыгуменні, пратаптаўшы сцежкі ад сядзібы да сядзібы. Наступілі цёплыя сонечныя дні, і пачалі абсыхаць прыгоркі. На прыпёку каля платоў палезлі з зямлі вострыя, як іголачкі, зялёныя ўсходы маладой травіцы; яны ўвачавідкі ішлі ў рост. Пачалі зелянець жоўтыя паплавы. Кожную раніцу можна было ўбачыць нешта новае. Над чорнымі, яшчэ голымі палямі, звінелі песні жаўранкаў. Прырода аджывала бурна, імкліва.

Па-дзіцячы ўзрадаваўся Андрэй, калі ўбачыў на вербалозіне, што расла на завулічным агародзе, жоўтыя, пушыстыя каткі; яго агарнула замілаванне. Ён адарваў галінку і прынёс у хату. Алена зірнула на яе, і змрочны пакутлівы позірк яе прыгожых вачэй, які не сыходзіў з яе схуднелага твару пасля Лісавецінай смерці, раптам пасвятлеў. Ад таго горкага дня, калі Андрэй вытнуў яе, яна ніколі не звярталася да яго з гаворкай. Што яе стрымлівала, Андрэй не ведаў: можа крыўда, можа адчуванне віны. Ва ўсякім разе яна ўскосна была вінавата, што Лісавета так зблізілася з Мікалаем Халустам, не папярэдзіла, як старэйшая і разумнейшая, чым гэта можа кончыцца. І ў выніку жудасная смерць, і столькі гора. І от цяпер вочы яе загарэліся.

— На нашай вербалозіне? — запытала яна.

— Уся абсыпана, галля не відаць.

Яна выхапіла галінку з Андрэевых рук, прытуліла яе да твару і зарыдала.

Андрэя гэта страшэнна ўразіла; здавалася, што нешта цяжкае, пякучае адарвалася ад яго, і легката ахапіла ўсё цела. Усё благое, што ён меў у душы супраць сястры, раптам знікла, не пакінуўшы следу. Яму хацелася сказаць ёй ласкавае слова, супакоіць, пашкадаваць, як шкадуюць маленькіх дзяцей. Але яна выскачыла з хаты.

— Не крыўдзі яе, Андрэечка, — сказала маці. — Хіба ты не бачыш, як ёй цяжка...

Андрэй, схіліўшыся, пастаяў хвіліну, тады падышоў да маці, узяў яе сухую натруджаную руку і прыціснуў да губ. Маці абхапіла рукамі яго галаву, пацалавала ў лоб і, прытуліўшы да грудзей, усхліпнула.

— Дзеткі мае... дзеткі мае... — шаптала яна праз плач.

Праз некалькі хвілін Андрэй выйшаў на двор. Яму хацелася даведацца, куды пайшла Алена. Ён убачыў яе на завулічным агародзе; яна ішла да тоўстай вербалозіны, што расла на самым канцы каля плота. Ногі яе танулі ў вільготнай глебе, яна ледзь выцягвала іх, рызыкуючы пакінуць чаравікі ў гэтай гразі, але не спынілася. Яна нібы здагадалася, што Андрэй наглядае за ёй, і азірнулася.

Потым не адзін раз думаў Андрэй, як гэта здарылася, што маленькая веснавая галінка з каткамі так уплыла на адносіны паміж ім і сястрой. Што гэта такое, у чым прычына? Няўжо так мала патрэбна чалавеку, каб абудзіць яго пачуцці, каб яны сталі па-сапраўднаму чалавечымі... Хто ведае! А тады ў сэрца яго прыйшло нешта лёгкае, добрае і шчаслівае. Яго цяпер не палохала тое, самае горшае, пра што ён ніколі не забываў, аб чым думаў заўсёды і нават сніў. А хвалявала яго тое, што прыйшла вясна, скора абсохнуць палеткі, на носе сяўба. Ці ўправяцца яны з братам Янам, ці не запозняцца, не адстануць ад суседзяў?.. Бацька перад смерцю казаў, каб з кожнай работай упраўляўся ўпору, каб не спазняўся, каб між работамі знаходзіўся час на адпачынак, не толькі сабе, але і коням. Так яно, вядома, і было б, каб Тамаша не ўзялі на вайну і не хварэла Яніха. А цяпер!.. Ён не мае права пакінуць Яна, як некалі Ян не пакідаў яго. Зміцер яшчэ падлетак, ні араты, ні касец. Сам Ян не здолее адзін урабіць усё і на полі, і на сенажаці. У апошні час чалавек здаўся, пастарэў і паслабеў. Яніха ў хаце яшчэ сёе-тое можа, а ўпрэгчы яе ў работу на полі і агародзе нельга..

І от каткі... Алена вунь там на агародзе каля вербалозіны. «Ах, каткі, каткі... як жа вы падмацавалі мяне!» — думаў Андрэй. Цяпер ён быў упэўнены, што ўсё будзе добра. У яго ёсць Іван. А ў Чыжэвічах ён знойдзе Яну дзяўчыну, мо на лета, мо на ўвесь год. Як захоча Ян. Калісьці ён гаварыў яму пра гэта, а потым неяк абышлося, забылася. А цяпер патрэбна дзяўчына, каб гаспадарку дагледзела, агарод урабіла.

У хату ісці не хацелася. Нейкі ўзнёслы веснавы настрой авалодаў Андрэем. Яго пацягнула ў сад, каб пабыць адзін на адзін з сабою, падумаць, нават памарыць. Андрэй не разумеў, што з ім зрабілася, але ведаў, што ён ужо не такі, які быў раней. У яго жыццё ўвайшло столькі новага, што ён зрабіўся іншым чалавекам. Разумнейшым ці што? Нават чуллівейшым, ласкавейшым, лепшым...

Сад быў яшчэ голы, бязлісты, але жывы; галіны дрэў не адвісалі да зямлі, як зімой, а цягнуліся ўгару, да сонца. На яблынях і грушах засталося шмат мінулагодніх лістоў; там захаваліся лічынкі вусені, якія з наступленнем цеплыні ператворацца ў ненажэрных калмагых чарвякоў і аголяць увесь сад. Ды не толькі свой. Яны запалоняць усе засцянковыя сады. Трэба пазычыць у Гарасіма садовыя нажніцы, абрэзаць усю гэтую пошасць і спаліць. Раней ён сам займаўся такой работай, а цяпер даручыць Івану. Акрамя таго трэба параіцца з Гарасімам, як абкопваць дрэвы, а гэта зрабіць неабходна, бо сад з кожным годам меней радзіў і ніякага прыбытку не даваў, а грошы так былі патрэбны... «Чорт ведае што, — са злосцю на самога сябе падумаў Андрэй. — Вечна гэтыя праклятыя думкі пра гаспадарку, пра грошы... Хіба толькі дзеля гэтага жывеш, дзеля гаспадаркі і грошай?.. Некалі падумаць пра сябе, пра сваю долю і шчасце, нібы ты вол, бо вечна ходзіш пад ярмом»...

Ён узняў вочы і зірнуў на Гарасімаву сядзібу: па двары да хаты ішоў Міхал Асіеўскі. Сэрца ў Андрэя здрыганулася: ён ведаў, чаго ходзяць да Гарасіма: не з дабра. Не інакш, адбылося нейкае няшчасце.

— Міхал! — гукнуў ён, падыходзячы да плота. — Куды ты ідзеш?

— Да Гарасіма.

Міхал трымаў пад рукой скрутак, — гасцінец Гарасіму.

— Падыдзі сюды, Міхал... А чаго ты да яго ідзеш?

— Ды от Ганна нешта захварэла.

— Даўно?

— Ды от чатыры дні назад. Спачатку гарачка падхапілася, а цяпер пластом ляжыць.

— Прастыла, мабыць?

— Ну, але. На Жаночым лужку бялізну паласкала... Ад таго і пачалося. Спачатку трохі хадзіла... І каля печы сёе-тое рабіла.

Жаночы лужок быў зусім не лужок, а невялікая, затое глыбокая азярына каля засценка Жывіцы. Жаночым лужком яе празвалі таму, што жывіцкія жанкі паласкалі там бялізну. Летам у святочныя дні ў ім купаліся. Нават быў човен адзіны на ўвесь засценак. Толькі рыба не вадзілася ў тым лужку-азярыне.

Андрэй пабялеў, і кулакі яго сціснуліся мімаволі.

— Вар'яты! — крыкнуў ён. — У такую пару пасылаць дзяўчыну на Жаночы лужок паласкаць бялізну! Там жа лед толькі што растаў.

— Ды от жа... — Міхал схіліў галаву.

— Ды от жа! — з лютай злосцю паўтарыў Андрэй. — Сястрыной смерці хочаш, каб пасаг яе табе застаўся, сволач!

— Ды што ты, Андрэй... — спалохана заміргаў вачыма Міхал. — Ды хіба я думаў калі пра гэта!..

Андрэй зірнуў на разгубленую бездапаможную Міхалаву постаць і зразумеў, што, мабыць, сказаў лішняе, аднак злосць яго не стала ад гэтага меншай.

— Не думаў? Дык чаму ж ты паленаваўся вады з калодзежа прынесці, каб яна бялізну ў хаце папаласкала?

— Дык у нас жа... усе так...

— Маўчы, сугней! Да доктара трэба, а не да Гарасіма.

Ён павярнуўся і шпарка пайшоў у дрывотнік, дзе Іван сек і складаў дровы з Маргоў.

— Выкаці з-пад паветкі калёсы, — загадаў ён яму, — падмаж восі, але спачатку насып Гнядому паўмеркі аўса. На воз пакладзі канюшыны.

Іван зірнуў на яго з недаўменнем: на калёсах яшчэ ніхто не ездзіў, бо не падсохлі дарогі, але адразу пайшоў у свіран.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

ШТО ЧЫТАЕ МОЛАДЗЬ?

Супрацоўнікі Ленінградскага дзяр-
аўнага інстытута культуры імя Круп-
кай два гады назад заняліся дасле-
аваннем чытацкіх інтарэсаў мола-
зі. Узначаліў гэтую работу супра-
оўнік кафедры бібліятэказнаўства
рыс Банк. Выкладчыкі і студэнты
стытута правялі ананімную анкету
род 13 тысяч чалавек. Яе галоўны-
і пытаннямі былі наступныя:

Ці чытаеце вы кнігі, з якой мэтай?

Чые творы вам асабліва падабаюц-
: дарэвалюцыйных пісьменнікаў, са-
цкіх, зарубежных?

Ці чытаеце вы грамадска-палітыч-
ую літаратуру, тэхнічную, прырода-
аўча-навуковую?

Якія газеты і часопісы чытаеце?

Якімі бібліятэкамі карыстаецеся?

Ці патрэбна вам дапамога ў выба-
ы кніг?

Анкета была распаўсюджана на 22
радпрыемствах Ленінграда, сярод
абочых будаўнічых арганізацый, ра-
отнікаў канструктарскіх бюро і на-
укова-даследчых інстытутаў, сярод
удэнтаў навучальных устаноў гора-
а. Узрост апытаных—ад 16 да 28
од. Даследчыкі прааналізавалі так-
ама 5300 чытацкіх фармуляраў у
бібліятэках і ўзялі інтэрв'ю ў агульнай
кладанасці ў трох тысяч маладых
ытачоў.

Былі вылучаны тры групы чыта-
оў: рабочыя, інжынерна-тэхнічныя
аботнікі і студэнты.

Што ж паказала даследаванне?

Усе апытаныя, за выключэннем
зесятка, пастаянна маюць справу з
нігай. Яны карыстаюцца грамадскі-
і бібліятэкамі, самі купляюць кнігі,
яруць у таварышаў. Вось найбольш
ыповыя выказванні аб мэтах чытан-
я: «Выпрацоўка светапогляду», «Ін-
электуальнае развіццё і выхаванне
сабе якасцей Сапраўднага Чалаве-
а», «Каб усё ведаць», «Чытаю, каб
абыць веды, якія памогуць ісці ў
агу з сучасным развіццём тэхнікі»,
Хачу набыць веды, патрэбныя для
работы і актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці».

Многія пазнавальнае чытанне спалучаюць з чытаннем для адпачынку, для забавы. І толькі нязначная частка моладзі чытае толькі для забавы. Прадстаўнікі ўсіх трох груп чытаюць грамадска-палітычныя і літаратурна-мастацкія часопісы: «Юность», «Огонёк», «Смена», «Крокодил», «Молодая гвардия», «Работница».

Студэнты, маладыя спецыялісты шмат чытаюць прыродазнаўча-навуковай літаратуры. Больш палавіны апытаных сцвярджальна адказалі на пытанне, ці чытаюць яны грамадска-палітычныя кнігі.

Як паказала анкета, газеты чытаюць 97 працэнтаў апытаных, у аднолькавай меры—рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі і студэнты. Больш за ўсё чытачоў у «Комсомольской правды», на другім месцы «Известия», на трэцім — ленінградская маладзёжная газета «Смена».

Абследаванне, праведзенае ленінградцамі, дазволіла высветліць адносіны моладзі да мастацкай літаратуры, паказала, якім аўтарам аддаюць перавагу маладыя чытачы.

Найбольшай любоўю ва ўсіх трох групах апытаных карыстаюцца творы Льва Талстога. Трошкі меншая колькасць чытачоў назвала імя Пушкіна. Трэцім у спісе любімых у рабочай моладзі быў Чэхаў. Інжынерна-тэхнічныя работнікі і студэнты таксама назвалі Пушкіна і Чэхава.

У многіх анкетах тлумачыцца, чаму аддадзена перавага таму ці іншаму пісьменніку. Калі гаворка ідзе пра Л. Талстога, найбольш часта сустракаецца фраза: «Ні з кім не параўнаны па майстэрству». Пра Пушкіна гавораць так: «Вядома, Пушкін!», нібы падкрэсліваючы гэтым безагаворачнае прызнанне велічы паэта. Маладыя інтэлігенты часцей, чым рабочыя, выказваюць сваё захапленне Чэхавым: «Выключная тонкасць, уменне разабрацца ў чалавечай душы», «Высокая гуманнасць і псіхалагізм».

З рускіх класікаў, побач з трыма названымі, найбольш папулярныя Гогаль, Дастаеўскі, Купрын, Лермантаў, Някрасаў і Тургенеў.

З савецкіх аўтараў «любімейшы з любімых—Шолахаў». Яго называюць «глыбай» і гавораць пра яго прыкладна таксама, як пра Льва Талстога. Усе тры групы любяць Горкага, маладыя рабочыя вылучаюць Фадзеева, студэнты—Маякоўскага. У анкетах інжынерна-тэхнічных работнікаў часта сустракаюцца імёны Аляксея Талстога, Эрэнбурга, Паўстоўскага (якім зачытваюцца, дарэчы, і многія студэнты).

Анкета выявіла вялікую цікавасць моладзі да паэзіі наогул і да маладых паэтаў, у прыватнасці.

Па дадзеных праведзенага абследавання дэтэктыўная літаратура патрошку траціць чытача, затое прыкметнае імкненне да навуковай фантастыкі: называюцца сярод любімых пісьменнікаў імёны Бяляева, Яфрэмава, Казанцава.

Шмат прыхільнікаў у мемуарнай літаратуры.

Цікава, што ўсе каментарыі ў анкетах, якія тлумачаць любоў да таго ці іншага пісьменніка, дадзены чытачамі па ўласнай ініцыятыве (у анкеце не было такой просьбы). Гэта гаворыць пра роздум над прачытаным. Ёсць у анкетах і крытычныя выказванні. Маладыя людзі, адзначаючы недахопы некаторых твораў савецкіх аўтараў, патрабуюць «замест «выкраек людзей» паказваць паўнакроўных сучаснікаў».

Вялікую цікавасць выклікае ў маладых чытачоў зарубежная літаратура. Яны называюць шмат імёнаў, але асаблівай папулярнасцю карыстаюцца Драйзер, Лондан, Рэмарк, Заля, Хемінгуэй.

На пытанне, ці патрэбна дапамога ў выбары кніг, большасць адказала коратка—«не». Настолькі добра арыентуюцца ў моры літаратуры, што не маюць патрэбы ў дапамозе? Напэўна, злуе апека, да якой асабліва ўразлівая моладзь.

Пераважная большасць маладых людзей мае свае асабістыя бібліятэкі самага разнастайнага зместу.

Галіна СІЛІНА,
карэспандэнт АДН.

Філарманічны каляндар — ЛЮТЫ

Лютаўскія канцэрты ў Мінску распачынае Варонежскі народны хор. Гэты творчы калектыў, народжаны ў час вайны, мае багатыя традыцыі. Да нас хор едзе з новай праграмай, якую з поспехам паказаў перад гэтым у Маскве.

Выступленні варонежцаў будуць праходзіць з 1 па 4 лютага, а 5 і 6 лютага перад мінчанамі выступіць другі цікавы калектыў — Дзяржаўная харавая капэла Арменіі. Капэла першая ў Савецкім Саюзе выконвае такія творы, як «Стабат Матэр» Расіні (канцэрт 5 лютага) і Кантата Шуберта (канцэрт 6 лютага). У праграму канцэртаў уваходзіць таксама кантата А. Аруцюняна «Радзіма» і Рэквіем Моцарта. Капэлай і Дзяржаўным сімфанічным аркестрам БССР будзе дырыжыраваць заслужаны дзеяч мастацтваў Армянскай ССР А. Чэкіджан.

Да ліку артыстаў, якія стварылі на эстрадзе свой стыль, свой жанр, належыць сатырык Пётр Мураўскі. Канцэрты групы Ленінградскай эстрады з удзелам П. Мураўскага будуць праходзіць у нас з 8 па 13 лютага. У складзе калектыву дыпламант Усесаюзнага і Усерасійскага конкурсаў Л. Краўцова (фельетоны), заслужаны артыст РСФСР Ф. Саўчанка (жанглёр), лаўрэат Усерасійскага конкурсу В. Осіпаў (музычная эксцэнтрыяда), лаўрэаты Усерасійскага конкурсу Ф. Калімулін і Э. Казан-Джан (акрабатыка), ансамбль дыпламантаў Усерасійскага конкурсу артыстаў эстрады «Сяброўкі», спявак В. Бясцэнны і інш.

13 лютага ў філармоніі сімфанічны канцэрт.

16 лютага ў Мінск прыязджае арганіст з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі Андрэас Бушнакоўскі. У праграму яго выступленняў уваходзяць Прэлюдыя і фуга мі-мінор Букстэхудэ, Варыяцыі на таму французскай песні Шэйта, Трыо-саната мі-бемоль-мажор, Фантазія і фуга соль-мінор Баха, Саната Вайраўха і Фантазія і фуга на тэму Баха (твор 46) Рэгера.

18 лютага ў філармоніі сімфанічны канцэрт, а 19 пачынаюцца гастролі яшчэ аднаго вялікага выканаўчага калектыву — Омскага народнага хору. Калектыў не раз прадстаўляў савецкае мастацтва за рубяжом, прымаў удзел у міжнародных фестывалях. Амічы славяцца сваёй асаблівай, «мяккай» манерай спявання. Цікавыя іх танцы. Канцэрты хору працягнуцца пяць дзён.

20 і 24 лютага ў філармоніі сімфанічныя канцэрты.

25 лютага пачынаюцца гастролі групы артыстаў Ленінградскай эстрады з удзелам вакальнага ансамбля сясцёр Фёдаравых. Майстэрства сясцёр добра вядомае і не патрабуе, як кажуць, каментарыяў. Дастаткова адзначыць толькі, што амаль у кожнай рэспубліцы ў Фёдаравых цяпер ёсць «сёстры» — форма сямейнага вакальнага ансамбля аказалася вельмі ўдалай.

Канцэрты ленінградцаў будуць праходзіць у Мінску да 28 лютага, а 27 лютага ў нас сімфанічны канцэрт.

Такі наш план на люты. Як бачаць чытачы, праграма гастроляў даволі насычаная. Чакаем вас у канцэртнай зале, дарагія таварышы!

А. КАРДЫМОН,
дырэктар - распараджальнік канцэртнай залы філармоніі.

СУСТРЭЧА Ў РЭДАКЦЫІ

Члены секцыі крытыкі Саюза мастакоў БССР, мастацтвазнаўцы, мастакі, пазаштатныя аўтары газеты сустрэліся 28 снежня ў рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва», каб разам з рэдкалегіяй абмеркаваць планы асвятлення ў газеце пытанняў выяўленчага мастацтва. У размове за рэдакцыйным сталом прынялі ўдзел старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР Ул. Стальмашонак, мастацтвазнаўцы П. Герасімовіч, Л. Дробаў, І. Ялатамцава, мастакі З. Азгур, В. Гаўрылаў. Было вырашана падобныя сустрэчы зрабіць традыцыйнымі.



Мірскі замак. Фота АЎТАРА.

Помнікі нашага краю
Мірскі замак

Мір — назва аднаго са старажытных гарадоў Беларусі. Першае ўпамінанне аб ім мы знаходзім у летапісах 1395 года, дзе гаворыцца, што крыжаносцы пад кіраўніцтвам гросмайстра ордэна Конрада фон Юнінгена ў тым годзе напалі на Мір і спустошылі яго ваколіцы. У 1490 годзе горад становіцца ўласнасцю беларускага магната Юрыя Ілініча.

1505—1506 гг. адзначаны жорсткімі набегамі татар. Няшчасці, прынесеныя татарскім нашэсцем, міжусобныя войны феадалаў і, галоўным чынам, варожыя адносіны з магутным вяльможам Міхалаем Глінскім, прымусілі Юрыя Ілініча ў 1505—1510 гадах пабудаваць умацаваны замак.

Роду Іліничаў замак належаў да 1568 года. Потым ім на працягу амаль двух з палавінаю стагоддзяў валодалі Радзівілы (Нясвіжская лінія). У другой палавіне XIX стагоддзя замак набыў князь Святаполк-Мірскі, які выкарыстаў сугучнасць назвы горада з яго імем, каб выдаваць Мір за сваё родавае гняздо.

На працягу стагоддзяў замак быў сведкам шматлікіх войнаў, асад і штурмаў, у час якіх цярпеў значныя разбурэнні.

На беларускай зямлі ў розны час было пабудавана шмат крэпасцей і замкаў. У залежнасці ад прызначэння і ролі, што выконвалі тыя або іншыя ўмацаванні, адрозніваюцца іх планавыя і архітэктурна-дэкаратыўныя кампазіцыі. Калі Гродзенскі замак ствараўся ў якасці каралеўскага або вялікакняжацкага двара, а Лідская крэпасць—для размяшчэння гарнізона, дык замак у Міры таксама, як Нясвіжскі, Любачанскі і інш., быў пабудаваны як рэзідэнцыя вялікага феадала.

Мірскі замак пабудаваны ў некаторай аддаленасці ад горада. Кампазіцыя яго простая. План яго амаль правільны, набліжаны да квадрата чатырохкутнік, утвораны магутнымі крэпаснымі сценамі. Бакі чатырохкутніка маюць даўжыню ад 72 да 78 метраў. Па вуглах гэтага чатырохкутніка ўзвышаюцца чатыры вежы. Пятая, уязная, вежа размешчана пасярэдзіне заходняй, звернутай да горада, сцяны. У сярэдзіне замка, уздоўж паўночнай і ўсходняй яго сцен, размешчаны трохпавярховы палац. Замак апяразваўся землянымі валамі з бастыёнамі на вуглах. Валы дасягалі вышыні 8—10 метраў. Паміж валамі і крэпаснымі сценамі замка быў выкапаны роў, які запаўняўся вадою. Апроч таго, подступы да замка з паўднёвага боку прыкрывала рэчка, пазней ператвораная ў сажалку.

Комплекс замка, які існуе цяпер, ствараўся ў некалькі прыёмаў. Спачатку былі ўзведзены крэпасныя сцены (вышыня каля 12 метраў), вежы (вышыня 25—27 метраў) і невялікія жылыя памяшканні. У 1550 гадах уздоўж паўночнай і ўсходняй сцен быў пабудаваны трохпавярховы палац. Сажалка была выкапана ў 1896—98 гг.

Мірскі замак першакласнае абарончае збудаванне свайго часу. Пра магутнасць яго фартыфікацыйных канструкцый можна меркаваць хоць бы па найбольш слабай частцы кожнай крэпасці — браме. Праезд у галоўнай вежы замыкаўся трыма брамамі, быў забяспечаны апускнымі кратамі (герсай) і пад'ёмным мостам. Першая знадворная брама была зроблена ў прыбудаванай да галоўнай вежы паўкруглай сцяне — барбакане, якая мела наверсе баявую пляцоўку. У сярэдзіне барбакана быў выкапаны глыбокі катлаван, праехаць або прайсці цераз які можна было толькі па пад'ёмным мосце.

Усе пяць вежаў на кожным ярусе (паверхі — іх у вуглавых вежах па пяць, а ў галоўнай — шэсць) мелі байніцы: верхнія вялікія (гарматныя), унізе — невялікіх памераў. Завяршаліся вежы моцна развітымі карнізамі, у якіх былі зроблены байніцы-обламы.

Ля падножжа сцен былі гарматныя байніцы. У верхняй частцы сцены праразаліся падоўжнай галерэяй, якая злучала паміж сабою ўсе вежы. У сценах галерэі былі байніцы, накіраваныя як на паверхню, так і ўбок двара. Па версе сцен праходзіла баявая пляцоўка. І вежы, і сцены (у тым ліку і барбакан) завяршаліся зубцамі.

У Мірскім замку былі два падземныя ходы. Адзін вёў з сутарэння цэнтральнай вежы да ракі, і па ім абаронцы замка хадзілі па ваду. Для забеспячэння гарнізона правіянтам у час асады і для вылазак з сутарэння паўночна-заходняй вежы быў другі падземны ход, які канчаўся ў лесе, за паўтара кіламетры ад замка.

Архітэктурны вобраз замка вызначаюць, у першую чаргу, яго вежы. Кожная з іх на пэўнай вышыні пераходзіць з чатырохвуглавога падмурка на васьмярык. Прапорцыі трох вежаў паступова змяншаюцца, а галоўнай і паўночна-ўсходняй—узрастаюць.

Вежы і сцены замка вельмі багата дэкарыраваны. Апроч выкананых у кладцы арнаментальных паясоў, вежы ўпрыгожаны шматлікімі нішамі, рознымі па велічыні, прапорцыях і размяшчэнні, гэта надае своеасаблівасць архітэктурнаму абліччу кожнай вежы. Разам з тым аднолькавая глыбіня нішаў і арачны характар іх абрысаў збліжае дэкаратыўны ўзор гэтых вышынных кампазіцый.

Па вышыні і шырыні падмурка вылучаецца сярэдняя, уязная, вежа. Ад вуглавых яна адрозніваецца і сваёй агульнай пабудовай. Калі вуглавыя вежы пераходзяць з прамавугольнага сячэння на васьмярык прыкладна з трох чвэртак вышыні, дык сярэдняя — амаль з палавіны. Таму гэта вежа здаецца страйнейшай і значна вышэйшай за сваіх суседак.

Характэрна, што з усіх вежаў Мірскага замка найбольш прыгожыя, найбольш насычаныя дэкаратыўнымі элементамі паўднёва-заходняя і галоўная. Такое размеркаванне дэкору зусім лагічнае і адпавядае ролі вежаў у агульнай кампазіцыі замка. Іменна гэтыя вежы, якія не мяжуюць са сценамі палаца, успрымаюцца інакш, чым астатнія тры, што чытаюцца на фоне сцен палаца.

Кладка сцен Мірскага замка нагадвае кладку Каложскай царквы ў Гродна. Тут, як і ў Каложскай царкве, у цагляную кладку ўстаўлены вялікія камені, буйныя ўнізе і больш дробныя наверсе.

Фасады Мірскага замка раскрываюць усю своеасаблівасць і прыгажосць крапаснога дойлідства Беларусі XV—XVI стагоддзяў. Асаблівасць архітэктурна-мастацкага вобліка замка вызначаецца перш за ўсё тонкім адрозненнем яго вежаў і іх дэкаратыўнага ўзору і сілуэта. У розных спалучэннях на фоне неба гэты своеасаблівы «карагод» вежаў стварае надзвычайную разнастайнасць архітэктуры замка.

На жаль, гісторыя не захавала нам імя геніяльнага дойліда — стваральніка гэтай жамчужыны архітэктуры, пра выдатны талент, надзвычайную эрудыцыю, на дзіва тонкі густ якога сведчыць выключна гарманічнае спалучэнне рысаў і традыцый, уласцівых архітэктуры некалькіх народаў. Нам вядома, што непасрэднымі выканаўцамі праекта безымяннага дойліда былі простыя беларускія рабочыя людзі.

А. МІЦЯНІН,
кандыдат архітэктуры.

КАТКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

Андрэй тым часам крочыў у Жывіцы. Не прайшло і чвэрці гадзіны, як ён адчыняў дзверы ў хату Лукаша Асіеўскага. Той, свецячы лысінай, з акулярамі на носе сядзеў каля стала, уваткнуўшыся ў псалтыр. Калі Андрэй увайшоў, ён узняў галаву, — не адказаўшы на дзендобры, устаў. «Усе яны жываглоты такія, у бога ратунку шукаюць», — з шалёнай лютасцю падумаў Андрэй.

— Не да гульні ў нас, — злосна прамовіў Асіеўскі.

— Я не гуляць. Дзе Ганна?

— Хворая, — Асіеўскі ступіў крок наперад, схапіў Андрэя за рукаў, але ён абтрос яго, як пыл са світкі, і адчыніў дзверы ў Ганнін пакойчык.

Не раз ён быў тут і ведаў у гэтай хаце ўсе хады і выхады.

Ганна ляжала на ложку, і вочы яе былі заплюшчаныя. Андрэй зірнуў на яе, і нешта велізарнае і горкае напоўніла яго грудзі. Ганна цяжка дыхала, хваравіты румянец пакрыў яе шчокі. Цёмна-русыя косы былі расплецены і закрывалі ўсю падушку. Страціць яе!.. Вось з гэтым ён ніяк не мог пагадзіцца. Страціць яе... Толькі цяпер Андрэй зразумеў, колькі кахання і пяшчоты да гэтай дзяўчыны хавалася ў яго сэрцы.

— Ганна, — прамовіў ён і адчуў, што можа разрыдацца, як самая кволая жанчына.

Ён узяў яе рукі, такія цяпер слабыя і пакорлівыя, і пачаў цалаваць. Яна расплюшчыла вочы, доўга ўглядалася ў Андрэя, нібы не пазнавала, ці думала, што трызніць, потым прашаптала: «Андрэй» і зноў упала ў забыццё.

Андрэй не помніў, як ішоў з Жывіцаў дадому.

На двары стаялі калёсы, падрыхтаваныя ў дарогу, у палукашы ляжала ўся вупраж. Ён вывеў з хлява Гнядога і пачаў запрагаць. З хаты выйшаў Іван, каб памагчы.

— Куды ты сабраўся, Андрэй? — запытаў ён.

— У Старочын.

— Ці паспееш, ужо цераз поўдня.

— Паспею. — Ён намацаў у кішэні кашалёк і сеў на воз.

— Адчыні вароты, — загадаў Івану.

У тую вясну Андрэй першы ў наваколлі аднавіў калёсную дарогу. Цяжкавата было каню, пакуль выехалі на шлях, але Гняды, адпачыўшы пасля цяжкай зімы, ішоў бадзёра, не напінаючыся. У Маргах стала яшчэ лягчэй: тут хоць і не езджаная, але пясчаная дарога была сухая. У Андрэя пачало праясняцца ў галаве, дагэтуль там стаяў туман. Што скажуць людзі пра тое, што ён паехаў па доктара і прывязе яго не ў сваю хату, а ў чужую? У хату гэтага злыдня Асіеўскага? Што падумае сам Асіеўскі, Ганна? Нарэшце, як зірне на ўсё гэта Алена? Здаецца, адносіны паміж імі пачалі наладжвацца. А цяпер? Ды яна цяпер кожны раз папракне яму, абы толькі маленькая прычэпка. А прычэпак хопіць. Не такія яны з сястрой людзі, каб не было прычэпак. І зноў яго ахапіла неймаверная злосць на Асіеўскага. «Богу моліцца, стары сабака, псалтыр пад носам трымае, а дачка адна гарыць, як на агні... Хоць бы пасядзеў каля яе, гад, вады падаў, руку на галаву паклаў... Бацька... Горшы за жывёлу... Дзеўчанё без маткі вырасла, такая гаспадарка ўся на ёй... Служанку наняў бы, або хоць абэлтуха гэтага Міхала жаніў. Толькі касцоў, жанцоў ды малацьбітоў наймае, каб збажына ды сена не прапалі». Успомніў гаворку з Якавам. Той, нібы ў ваду глядзеў. «Сапраўды, гэты багамаленны смоўж не лепшы за Халусту і Кашчэя Бессмяротнага».

У Старочын прыехаў перад самым заходам. У бальніцы сказалі, што доктара няма, пайшоў дадому. Андрэй распытаў, дзе ён жыве і паехаў туды. Доўга стукаў, стоячы на ганку. Потым нейкая тоўстая бабізна прыадчыніла дзверы, сказала, што доктар не прымае, і ляпнула імі перад самым Андрэевым носам. Андрэй пачуў, як за дзвярыма грукнуў крук. «Замкнуліся, сволачы, панства праклятае»... Не для таго ён сюды ехаў, каб вярнуцца без доктара. А там Ганна... Ганна! Яна чакае яго. Верыў, што чакае... «Усе вокны павыбіваю, а ўсё роўна выцягну...»

Ён падышоў да акна, што глядзела на вуліцу, і стукнуў па раме пугаўём. Акно аж загуло. Каб удар быў хоць крышачку мацнейшы, высыпаліся б усе шыбы. У хаце нехта залямантаваў тонкім парасячым голасам, мабыць, тая тоўстая бабізна. І тут адчыніліся дзверы. На ганак выйшаў сам доктар — сярэдніх год мужчына, які пачаў ужо таўсцець. Ён, мабыць, толькі што пагаліўся, бо гладкі твар яго блішчаў. Ён акінуў Андрэя позіркам ад ног да галавы, але вочы яго былі не злыя і трошкі задумлівыя.

— Вы што ж гэта, галубок? Прыехалі да мяне, каб вокны павыбіваць? — запытаў ён, строга зірнуўшы на Андрэя, але ў голасе яго адчувалася нешта вясёлае, цікаўнае.

— У хаце пагаворым, доктар, — адказаў Андрэй, рашуча піхаючы яго ў пакой.

Мабыць, нешта незвычайнае ўбачыў Кнопф на твары Андрэя, бо, спыніўшы на ім доўгі позірк, прамовіў:

— Супакойцеся, галубок. Сядзьце.

— Некалі сядзець, доктар.

— Ну дык што ў вас?

— Я прыехаў, доктар, каб завезці вас да хворай.

— Хм... А куды вы збіраецеся мяне завезці? Далёка?

— У Жывіцы, да хворай дзяўчыны.

— Восем вёрст, — задумліва прамовіў доктар. — А хто яна тая дзяўчына? Ваша сястра?

— Гэта не мае значэння, але калі вам так хочацца ведаць, то не сястра.

— Мае значэнне, галубок. Я па вашаму твару пазнаў, што яна вельмі дарагі для вас чалавек. Нявеста?

— Хворая дзяўчына, доктар, — узлаваўся Андрэй. — Збірайцеся. — Ён выняў з кашалька залатую пяцёрку і паклаў на стол.

Доктар на яе і не зірнуў.

— Якія вы разумны: «Збірайцеся!» А чым хварэе тая дзяўчына, вы ведаеце? Я ж павінен узяць з сабой усё, што спатрэбіцца.

Андрэй пачаў расказваць. Доктар ківаў галавой, перапытваў адно і тое ж па некалькі разоў. І калі Андрэй кончыў, доктар меў нейкае ўяўленне аб Ганнінай хваробе. Сумка яго была напакавана. Ён узяў з сабой яшчэ і банкі, тады выйшаў на двор і сеў на воз.

Доктар аказаўся вельмі гаваркім чалавекам. Ён распытваў Андрэя пра яго жыццё, і калі пад'ехалі да Жывіцаў, думаў, што ўсё ведае пра Андрэя і пра Ганну. І як жа здзівіўся ён, калі Андрэй нават не зайшоў у хату да Асіеўскага, а, высадзіўшы доктара, развітаўся з ім у сенцах і сказаў, што паедзе дамоў у Малінаўку.

Дома ўжо ўсе спалі. Калі Андрэй запаліў у хаце лямпу, то першае, што кінулася яму ў вочы, былі каткі — цэлы венічак у гладышы з вадой, які стаяў на стале...

Выступаюць ветэран польскай эстрады Мячыслаў Фог і Крысціна Канарска.

Фота Э. ТРАГУБОВІЧА.

Нашы госці
АРТЫСТЫ ВАРШАЎСКАЙ ЭСТРАДЫ

Крысціна Канарска яшчэ
два гады назад была настаўні-
цаю ў школе. Але выключны
поспех ва Усяпольскім фесты-
валі на лепшае выкананне лі-
рычных песень забяспечыў
Крысціне магчымасць стаць па-
пулярнай артысткай Варшаў-
скай эстрады. І вось мы слу-
хаем у зале філармоніі, як
К. Канарска выконвае на поль-
скай, рускай, італьянскай мо-
вах песні пра мора, зоркі і чай-
кі, пра закаханых, пра чаканне
сярод кветак, пра хлопца, што
прыйдзе па сваю любую... Тут
наўмысна адзначана, што К. Ка-
нарска іменна выконвае, — не
толькі спявае — гэтыя прос-
ценькія творы пра добрыя па-
чуцці людзей, пра пошукі цеп-
лыні і сардэчнасці. Артыстка
вельмі тактоўна, двума—трыма
пластычнымі рухамі мізансцэні-
руе свае песні, стварае жанра-
вую сцэнку, замалёўку падзей,
арганічна і шчыра раскрывае
пачуцці сваіх герояў. Чымсьці
нагадваючы вядомую савецкую
эстрадную спявачку Эдзіту П'е-
ху, таленавітая Крысціна Ка-
нарска пакідае яркае ўражанне
не толькі сваёй шчырасцю і не-
пасрэднасцю, але і непаўтор-
насцю творчага почырку.

Слава Пшабыльска — вядо-
мая зорка эстрадных перадач
Польскага радыё і тэлебачан-
ня. Яна таксама ў сваёй твор-
часці карыстаецца пластыкай
рухаў, тэмпераментна «абыгры-
вае» падзеі, пра якія гаворыць
песня. Вельмі добра выкары-
стоўвае артыстка і моўныя ад-
ценні, слова ў яе заўсёды спа-
дарожнічае музычнаму нюансу.
У адрозненне ад К. Канарскай,
артыстка С. Пшабыльска ў
сваіх маленькіх музычных за-
малёўках быццам апавядае не
пра знаёмых герояў, а пра ся-
бе. «Аўтабіяграфічнасцю» ха-
рактэрна выкананне песень «Я
непрыгожая», «Ты глядзіш на
мяне», «Гавораць: цыганка»,
«Дзяўчына з Партафілё» і ін-
шых, якія Слава Пшабыльска
спявае на мовах польскай, рус-
кай, французскай, італьянскай...

Тадэвуш Вазняхоўскі таксама
спявак, але ён і аўтар песні
«Паслухай, што я табе скажу»,
акампаніятар на раялі, калі
спявае «Катарына, ах, ах, ах!»,
згрaбны танцор, калі выкон-
вае песню «Я шукаю сваю дзяў-
чыну», і наогул выключна пры-
вабны выканаўца песень «Са-
мая жаданая», «Цячэ Волга» і
шмат якіх іншых. З вялікай
лёгкасцю і непасрэднасцю
Т. Вазняхоўскі завязвае творчы
кантакт з глядзельнай залай,
робіцца добрым сябрам слуха-
чоў, але нідзе не пераходзіць
рубеж добрага густу, — нават
тады, калі сыходзіць са сцэны і
звяртаецца непасрэдна з выка-
наннем песні да пэўнай асобы з публікі (песня «Самая жаданая»).

І, нарэшце, апошні са спевакоў, што прымаюць удзел у канцэртах артыстаў Варшаўскай эстрады, — Мячыслаў Фог. У Польшчы яго завуць Нестарам польскай эстраднай песні. Ён прымаў удзел у 15 тысячах канцэртаў і напеў дзве тысячы грамафонных пласцінак. Амаль няма такой песні, якой бы не было ў рэпертуары М. Фога, і ў кожнай ён старанна падкрэслівае падтэкст твора. Асабліва гэта адчуваецца ў выкананні негрыцянскай народнай песні «Місісіпі», у польскай «На маёй вуліцы», у лірычных мініяцюрах «Чароўнасць» і «Песня пра маці».

Акрамя спевакоў, у канцэртах нашых польскіх сяброў прымаюць удзел артысты Варшаўскага тэатра аперэты Станіслава Кавальчык і Здзіслаў Славінскі (танцавальна-вакальны дуэт), эстрадны ансамбль пад кіраўніцтвам Януша Сента і канферансье Януш Будзінскі, які мякка і весела цэментуе праграму.

«Ча-ча», аперэтачная сюіта і «Чарльстон», што выконваюць С. Кавальчык і З. Славінскі, — гэта пароды на тое, з чым яшчэ даводзіцца сустракацца на сцэне. Але, калі ў першых двух творах артысты па сутнасці вельмі лагодныя ў сваіх адносінах да выконваемага і іронія не адчуваецца, дык «Чарльстон» пакідае ўражанне духоўнай пустаты яго прыхільнікаў.

Эстрадны ансамбль пад кіраўніцтвам Я. Сента складаецца з раяля, саксафона, электрагітары, кантрабаса і ўдарных інструментаў. Януш Сент, Юзаф Баёрак, Януш Сабесяк, Эдмунд Дорман і Рышард Стамнызускі —музыканты добрай кваліфікацыі, што відаць з выдатнага па сваёй віртуознасці выканання эстраднай п'есы «Вочы чорныя», твора Гершвіна «Чалавек, якога я кахаю», з акампанементаў салістам. Меншае ўражанне пакінулі п'есы Януша Сента «Шлях на Месяц» і «Экспрэс Варшава—Масква». Іх недахопам з'яўляецца адсутнасць яркай, уражлівай мелодыі.

Гаворачы пра недахопы праграмы артыстаў Варшаўскай эстрады, парайм дарагім гасцям адмовіцца ад некаторых двухсэнсоўных рэпрыз. Цікава было б пазнаёміцца не толькі з лірычнымі замалёўкамі з жыцця польскіх сяброў, але і з тым, што іх хвалюе ў грамадскім успрыманні рэчаіснасці.

І. НІСНЕВІЧ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

1 лютага

Першая праграма. 11.00 — тэлевізійныя навіны (М). 11.15 — да 50-годдзя Савецкай улады. «Слухай». Мастацкі фільм. 16.45 — праграма перадач. 16.50 — для школьнікаў. «Ленінградская піянерыя». Перадача з Ленінграда. 17.45 — «Зіма паэтычная». Літаратурная перадача. 18.05 — «Яны былі на Кубе». Спартыўная перадача. 18.25 — тэлевізійныя навіны. 18.45 — «Мера чуласці». Расказ пра людзей калгаса імя Калініна Карэліцкага раёна. 19.10 — музычны антракт. 19.20 — «Свет сёння» (М). 19.50 — Г. Немераў. «Гульня на сваім полі». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Перадача з Ленінграда. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «Далягляд». Маладзёжная праграма. («У непакораным Мінску». «Песні камсамольскага юнацтва». «Два тыдні ў Грэцыі»).

Другая праграма. 11.15 — «Алымкан». Тэлевізійны мастацкі фільм (М). 12.25 — «Галы, ачкі, секунды». Спорт за тыдзень (М). **17.45 — рэпартаж з завода «Дынама» (М).** 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — «Сельская навіна» (М). 18.40 — старонкі вашых пісьмаў (М). 19.20 — «Па Кіргізіі». «Там, дзе пачынаецца неба». Кінанарысы Фрунзенскай студыі тэлебачання. 19.50 — Ю. Міліюцін. «Трэмбіта». Фільм-аперэта. 22.00 — літаратурны аўторак. «Памяці А. С. Пушкіна». Перадача з Ленінграда.

2 лютага

Першая праграма. 11.00 — тэлевізійныя навіны (М). 11.15 — А. Карняйчук. «Банкір». Тэлевізійны спектакль. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — для школьнікаў. «Школа пачынаючага спартсмена» (М). 17.20 — «Там, дзе захоўваюцца скарбы» (М). 18.00 — «На прыз мотавелазавода». Тэлевізійны фільм. 18.10 — тэлевізійныя навіны. 18.30 — школьная фільматэка. «Народжаныя бурай». Мастацкі фільм. 20.05 — «Мінск у 1966 годзе». Расказваюць работнікі Мінскага гарвыканкома. 20.45 — камерныя цыклы. С. Пракоф'еў. «Мімалётнасці». 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — першынство Еўропы па фігурнаму катанню. Парнае катанне. Перадача з Браціславы.

Другая праграма. 11.15—для школьнікаў. «У нас спявае ўвесь клас». Перадача з Пярмі. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20— праграма Волгаградскай студыі тэлебачання «Хлопцы з нашага горада» (М). 19.40— лепшыя фільмы савецкага кіно. «Іван Грозны». Мастацкі фільм. Першая серыя (М). 21.30 — сімфанічны канцэрт.

3 лютага

Першая праграма. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «У краіне загадак» (М). 17.30 — для малышоў. «Пра самых шчаслівых». Фільм-канцэрт. 18.10 — тэлевізійныя навіны. 18.30 — «Рускі асілак». Расказ пра Івана Паддубнага. 18.50 — канцэрт з твораў беларускіх кампазітараў. 19.05 — «Дарогай бацькоў». Выступленне сакратара ЦК камсамола Беларусі А. Ваніцкага. 19.30 — «Памятай, Каспар». Мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі «Ленфільм». 21.00 —«Эстафета навін» (М). 22.00 — першынство Еўропы па фігурнаму катанню (мужчыны). Адвольная праграма. Перадача з Браціславы.

Другая праграма. 17.30 — насустрач XXIII з'езду КПСС. Рэпартаж з завода «Чырвоны пралетарый» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.35 — сустрэча з кампазітарам А. Мачавараяні (М). 19.35 — лепшыя фільмы савецкага кіно. «Іван Грозны». Мастацкі фільм. Другая серыя (М). 21.00 — **канцэрт Гуцульскага ансамбля песні і танца.**

Куток калекцыянера
Да стагоддзя Рамэна Ралана

Новая мастацкая паштовая мініяцюра прысвечана 100-годдзю з дня нараджэння выдатнага мастака слова, гуманіста, барацьбіта супраць фашызму і імперыялістычных войнаў Рамэна Ралана.

Шматгранная літаратурная спадчына пісьменніка карыстаецца вялікай папулярнасцю ў Савецкім Саюзе. Яго раманы «Жан Крыстоф», «Зачараваная душа», «Кала Бруньён» і іншыя творы перакладзены на многія мовы народаў СССР і выдадзены вялікімі тыражамі. Па звестках Усесаюзнай кніжнай палаты на 1 ліпеня 1965 года, творы Рамэна Ралана выдаваліся ў Савецкім Саюзе 206 разоў агульным тыражом сем мільёнаў экземпляраў на 21 мове народаў СССР і зарубежных краін.

Мастак Віктар Піменаў намаляваў на новай марцы партрэт Рамэна Ралана. Партрэт выкананы ў чырвона-карычневай каляровай гаме, а другі план малюнка (ілюстрацыя да жыццеапісання Бетховена) — у чорна-сіняй.

Цана маркі чатыры капейкі. Друк глыбокі. Памер жывапіснага поля 23,3 на 35,5 міліметра. Зубцоўка рамачная.

У Савецкім Саюзе і раней выпускаліся маркі, прысвечаныя вялікім французскім пісьменнікам. У маі 1952 года была выдадзена марка з партрэтам Віктара Гюго ў сувязі са 150-годдзем з дня яго нараджэння, у 1957 годзе—паштовая мініяцюра да 100-годдзя з дня смерці выдатнага французскага паэта-песенніка П'ера Беранжэ. Многія філатэлісты Савецкага Саюза ў сваіх калекцыях захоўваюць паштовыя мініяцюры з партрэтамі французскага філасофа — асветніка і пісьменніка Жана Жака Русо, філасофа-матэрыяліста Дэні Дзідро і іншых выдатных дзеячоў Францыі.

Марыя КАВАЛЕВА.
(АДН).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ:

г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара— 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры—3-21-53, аддзела мастацтва—3-24-62, аддзела культуры—3-22-04, аддзела інфармацыі—3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі—2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі—6-97-44.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда»
Індэкс 63856. АТ 02257